Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КАСТРЫЧНІК 26 1932 г. № 240 (4492)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Падрыхтавацца да сэзону — баявая задача торфапрамысловасьці. Юн. РОЗІН — Скарыстаць багацьці зямлі на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва (3 стар.). Г. ФУКСОН — Пакажам героеў гераічнай клясы (2 стар.). Я. ЯРМАШЭВІЧ—Арганізаваць масавы збор жалудоў (3 стар.).

Узброіць калгасныя масы агратэхнічнымі ведамі (1 стар.).

Зжалёны бульбы насустрач 15 Кастрычніку (1 стар.).

Шансьмальным пашырэньнем уцінцэхаў дамо калгасному рынку больш добраякаснай прадукцыі цыкорнаньку (2 стар.).

Гарбарнікі па-баявому змагаюцца за плян чацьвертага заключнага (2 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Прывітаньне ЦК КП Францыі (4 стар.).

Перад германскімі выборамі — кандыдаты кампартыі (4 стар.).

Сэнатар Бора за прызнаньне СССР (4 стар.).

Падрыхтавацца да сэзону—баявая задача торфапрамысловасьці

Партыя і ўрад ня раз у сваіх пастановах падкрэсьлівалі асаблівае значэньне здабычы мясцовых відаў паліву. XVII канфэрэнцыя УсеКП(б) у сваёй пастанове прапанавала вынайтыі гаспадарчым і грамадзкім партыйным арганізацыям «асаблівую ўвагу зьвярнуць на разьвіцьцё мясцовых, аналізных рэсурсаў (торф, сланцы і інш.)».

Ідучы па шляху шматлікага абмяркаваньня ўказаньняў партыі аб разьвіцьці мясцовых аналізных рэсурсаў, БСОР дабіўся вялізарных посьпехаў. Здабыча торфу ў бягучым годзе вырасла ў параўнаньні з мінулым годам па торфазаводах уніфікаванага Наркамцяжпраму на 157,5 проц., па Наркамлёгпраму — на 150 проц.

Перадавыя торфазаводы, перамагаючы ўсе цяжкасьці дабіліся ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня праграмы здабычы торфаапалу. Да такіх заводаў неабходна адносіць «Закрашынскі мох», «Грабянёва», «Свабода», «Ленінскі шлях», «Давыдаўка» і інш. Арганізацыі гэтых заводаў перамагаючы ўсе цяжкасьці, здолелі мабілізаваць масы на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду. Яны забясьпечылі сваячасовую сушку і ўборку торфу, давялоньне яго вільготнасьці да 30 проц.

Усё-ж ня гледзячы на дасягненьні асобных заводаў, торфяная прамысловасьць ня спраўлялася з тымі задачамі, якія на яе ўскладзены партыяй і ўрадам. Заданьне ў 1500 тыс. тон за сэзон 1932 году выканана ўсяго толькі на 55 проц. Асаблівы ганебнае адставаньне ў выкананьні вытворчай праграмы мы маем па сыстэме заводаў Белторфаб'яднаньня (кіраўнікі Малашэнак і Кузьмяцоў). Сёньняшнее заданьне заводамі Белторфу выказана ўсяго толькі на 54,2 проц. Каля 277 тыс. тон апалу недадана топкам сацыялістычнай прамысловасьці.

Рабочай сілай торфазаводы Белторфу ў пачатку сэзону былі забясьпечаны поўнасьцю. Але вельмі мала зроблена кіраўніцтвам для таго, каб замацаваць гэтых рабочых за заводамі, шляхам прэміяльнай расстаноўкі, ліквідацыі абязьлюдзьвя і ўраўнаваўкі ў зарплаце, шляхам заданьненьня матар'яльных культурна-бытавых умоў торфянікаў і торфяніц. У выніку, літаральна праз месяц застаюся рабочых толькі 70 проц.

У той час, як заводы «Закрашынскі мох», «Грабянёва» і інш. перадавыя заводы, давялі 100 проц. выкананьне дзённых заданьняў, кіраўнікі Белторфу трацілі сродкі на камандыроўкі ў Саюзторф і дабіваліся зьніжэньня праграмы. Нерэальнасьць плянаў яны ўгрунтоўвалі адсутнасьцю цыкорнаў на будаўніцтва жыльлёвых памяшканьняў для рабочых. Праграма, на іх думку, ня была выканана толькі ў выніку адсутнасьці цыкорнаў.

Аднак, факты абвяргаюць довады кіраўнікоў Белторфу. Вытворчая праграма ня выканана не таму, што цыкорнаў ня было, а таму, што адсутнічала канкрэтнае кіраўніцтва з боку Белторфу заводамі і заводзкіх, партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый вучасткамі, агрэгатамі і брыгадамі.

Пазыцыя апраўдаць такога становішча, што з 55 торфаменных прадпрыемстваў толькі 46, ды і тыя былі выгружаны на 60-70 проц. Вытворчая праграма выканана на 54,2 проц. Заданьне па ўзьніманьні прадукцыйнасьці працы выканана ўсяго на 67 проц. Сабекошт, замест зьніжэньня, значна павялічыўся.

Буйнейшыя торфазаводы — «Асінторф», «Зальшавік», «Чырвоны сьцяг», якія абазнаны поўнасьцю забясьпечыць апалам БелДРЭС, імя Сталіна, Менскі Эльвод, — не дасягнулі 40 проц. выкананьня плану торфа здабычы.

На Асінторфе» (дырэктар Яцманаў), замест мабілізацыі мас на выкананьне плану, замест практычнай дапамогі брыгадам — заўсёкай творчую ініцыятыву лепшых ударнікаў, даходзіў да парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці. Бюро партыйнага калектыву (сакратар Хаскін) за ўвесь сэзон ні разу ня склікала агульнага сходу партыйнай арганізацыі, не мабілізавала яе на барацьбу з заводзкімі непаладкамі. Усё гэта прывяло да таго, што цяпер працуючай сілы на «Асіны торфу» даходзіла да 200 проц.

На торфазаводзе «Зальшавік» (дырэктар Шульгоўскі) у выніку безгаспадарчасьці ў будаўніцтве чыгуначнай веткі, патрачана 200 тыс. руб. замест 56, вызначаных кашта рысам, 144 тыс. руб. узята з фонду зарплаты і ўкладзены на будаўніцтва веткі. Адным словам трацілася сродкі на права і налева без усякіх асьцярожнасьцяў. У выніку такіх аёдных адмоўкін да дзяржаўных сродкаў завод ня мае з чаго выплачваць пенсію рабочым. Агульная запазычанасьць па зарплаце па заводу складае 238 тыс. руб.

Аб гэтым добра ведала кіраўніцтва Белторфу, але ніякіх практычных мер да зьнішчэньня ня ўжывала.

Кіраўнікі Белторфу ўжо сёньня прарочаць аб тым, што і ў 1933 годзе праграма торфаздабычы ня будзе выканана. Яны гэта зноў такі ўгрунтоўваюць тым, што Наркамлёгпраму не адкуснае цыкорнаў на будаўніцтва. Як бачыце, зноў у галоўнай ролі выступаюць цыкорні і інш. «аб'ектыўныя прычыны».

Зусім мала робіцца для таго, каб высушыць, убраць і здаць торф спажыўцу, і атрымаць ад яго грошы, выплаціць зарплату рабочым-торфянікам, адзяніць бараці і сур'ёзна ўзяцца за падрыхтоўку балот да сэзону 1933 году.

Чацьверты квартал зьяўляецца рашаючым у падрыхтоўцы балот да сэзону. У першым годзе другой пяцігодкі заводамі Белторфу па вінна быць здабыта 691 тыс. торфу. З гэтай задачай ёсьць усе магчымасьці справіцца, для чаго партыйным, прафсаюзным і гаспадарчым арганізацыям неабходна сур'ёзна ўзяцца за разгортваньне будаўніцтва сталовак, клубаў і жыльлёвых памяшканьняў, быць гатовымі да прыёму рабочых. Неабходна выкананць дырэктывы партыі і ўрэду аб стварэньні сталых кадраў рабочых торфянікаў.

Ад сваячасовай падрыхтоўкі балот залежыць пасьпяховае выкананьне праграмы торфаздабычы ў сэзоне 1933 году. Час ужо зразумець кіраўнікам Белторфу, што ня выкананьне плану ў сэзоне бягучага году і ў выніку непадрыхтаванасьці да новага сэзону.

Здавалася-б, што кіраўніцтва торфапрамысловасьці ўлічыць памылкі і промахі мінулага году з тым, каб не паўтараць іх у гэтым годзе. Між тым яны ня ўлічаны, а больш патмыляюцца.

Існуе поўная замацнанасьць, як па заводах так і ў Белторфаб'яднаньні. Аб гэтым сьведчаць лічбы: гадавое заданьне па капанні канаў выканана на 15 проц. Такі-ж процант выкананьня і па расчарчоўцы. Па паліроўцы балота гадавое заданьне выканана ўсяго толькі на 8,1 проц., а на зьнішчэньне верхняга ачосу і падрыхтоўцы да здабычы фрэзэрнага торфу гадавое заданьне выканана на 23 проц. Ганебныя лічбы. Яны павінны былі мабілізаваць апарат Белторфу для канкрэтнага кіраўніцтва торфазаводамі, але гэтага яшчэ няма.

На працягу тыдня кіраўніцтва Белторфу абмяркоўвалася зрабіць даклад на прэзыдыум ЦП саюзу аб падрыхтоўцы балот. Гэта гаворыць аб тым, што кіраўнікі бацца, каб шырокая грамадзкасьць не адарвала заслону безгаспадарчасьці, адсутнасьці тэхнічнага і гаспадарчага кіраўніцтва прадпрыемствамі.

Партыйныя арганізацыі торфапрамысловасьці павінны зразумець, якія адказныя задачы перад імі пастаўлены партыяй і ўсёй краінай у справе забясьпечэньня электрастанцый і заводаў апалам.

Торфапрамысловасьць мае ўсе магчымасьці для таго, каб да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі рапартаваць аб гатоўнасьці сустрэць сэзон 1933 году.

ЭШАЛЁНЫ БУЛЬБЫ НАСУСТРАЧ XV КАСТРЫЧНІКУ

Да 1 лістапада поўнасьцю скончыць адгрузку

У падарунак Кастрычніку

ЖЛОБІН.

У адказ на ліст ленінградзкіх рабочых, і ў адзнаку XV гадавіны Кастрычніка, рад калгасаў раёну перавыканалі свае пляны па адгрузцы бульбы Ленінграду.

Калгасы Папараўнянскага сельсавету выканалі свае заданьні на 118 проц., здаўшы звыш пляну 40 тон бульбы. Калгасы Мірмальскага сельсавету здалі звыш пляну 43,2 тоны бульбы. Калгасы Майскага сельсавету выканалі свой плян на 224 проц. Бабоўскага—на 125 проц. Гэта дало магчымасьць раёну на 22 кастрычніка выканаць агульны плян адгрузкі бульбы Ленінграду на 72,6 проц. (БЕЛТА).

ЗАГАД № 2

шасьцёркі пры СНК і ЦК па загатоўцы і адгрузцы бульбы пралетарскім цэнтрам

§ 1.

За датэрміновае выкананьне пляну адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам прэміяваць старшыню Мехаўскага сельсавету Гарадоцкага раёну тав. Сьцепанчаку і сакратара партячэйкі Мехаўскага сельсавету тав. Яцкевіча па 150 руб.

§ 2.

За пасьпяховае выкананьне плянаў вываз кі бульбы Тумінецкім сельсаветам, Аршанскага раёну, і за перавыкананьне здачы бульбы для адгрузкі калгасамі гэтага-ж сельсавету — прэміяваць работнікаў сельсавету на 200 руб. і для перадавых калгасаў, сельсавету — 300 руб.

§ 3.

Адзначаючы ўдарныя тэмпы работы лельчыцкіх арганізацый і ўсёй грамадзкасьці раёну, якія забясьпечылі далёкавіднае выкананьне заданьня па адгрузцы бульбы Ленінграду — 500 тон, ня гледзячы на цяжкія шляхавыя ўмовы, прэміяваць работнікаў раёну на суму 1.000 руб., з якіх 50 проц. прэм таварамі, перавёўшы гэту суму ў распарадконьне раённай тройкі для прэміяваньня асобных, найбольш паказаўшых сябе таварышоў па адгрузцы бульбы.

СНК — К. БЭНЭК.

Вопыт Мехаўскага сельсавету не скары станы

ГАРАДОК. (Наш кар.). Паводле пляну, Гарадоцкі райзагатовіць і адгрузіць 3.080 тон бульбы. На 20 кастрычніка плян выканан па калгасах на 57 проц., а па аднаасобным сэктары на 39 проц. Па спатканьні цьвёрдых заданьняў у райзагатовестак няма. У заводы фігуруюць абсалютныя лічбы фактычна зданай бульбы. Разьмер заданьняў невядомы.

Рад сельсаветаў ганебна адстаюць па выкананьні сваіх плянаў. Па Саладухінскім сельсавеце плян загатовак і адгрузкі выкананы на 24,2 проц., па Горкаўскім—на 31,1 проц., Зайкаўскім—34,2 проц., Бярэцкім—35,5 проц. і г. д.

Першым у раёне выканаў свой плян на 103,98 проц. Мехаўскі сельсавет. Раённыя арганізацыі ўзьнялі хадайніцтва перад Камзагспа аб прэміяваньні гэтага сельсавету.

Райспажыўсаюз, раённыя арганізацыі, нават рэдакцыя раённай газэты «Калгасная праўда», не скарысталі вопыту Мехаўскага сельсавету для падцягненьня адстаючых.

Ударнікі адгрузкі прэміяваны

ВОРША.

У выніку баявой мабілізацыі грамадзкасьці, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў, ТУМЕНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ РАЁННАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ, ДАТЭРМІНОВА ПЕРАВЫКАНАЎ ПЛЯН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ. Усяго адгружана на 21 кастрычніка 17 вагонаў — 286,6 тон, што складае 103 проц. да пляну.

Калгасы здалі 251 тону, замест 189 паводле пляну. Некаторыя калгасы, як «Чырвоны мэліяратар», «Ударнік», «Калгасьнік Беларусі», перавыканалі заданьне.

За датэрміновае выкананьне пляну па адгрузцы бульбы, раённая апэрацыйная тройка пастанавіла ПРЭМІЯВАЦЬ СТАРШЫНЮ ТУМІНІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ТАВ. ШЧАРБАКОВА 150 РУБ., СТАРШЫНЮ СЕЛЬСПАЖЫТУАВАРЫСТВА ТАВ. ПАХОМЧЫКА І СТАРШЫНЬ КАЛГАСАЎ «ЧЫРВОНЫ МЭЛІЯРАТАР», «УДАРНІК», «КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ».

Л. П.

Загатоўшчыкі працуюць у сьляпую

КАПЫЛЬ. (Наш кар.).

Капыльшчына ў гэтым годзе павінна адгрузіць пралетарскім цэнтрам 2.140 тон бульбы. На 22 кастрычніка плян адгрузкі выканан усяго на 24,3 проц. Райзагатовіць адгрузіў 47,7 проц. пляну. Кантора БНГ зрывае адгрузку. Пры заданьні адгрузіць 1.770 тон фактычна адгружана 150 тон, або 8 проц. Кантора нават ня мае дакладных вестак аб ходзе адгрузкі бульбы. Між тым, ёсьць усе магчымасьці для сваячасовага выкананьня пляну.

Кіраўнікі канторы Белплодагародніны зрыў пляну адгрузкі бульбы рабочым цэнтрам павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

А.

Перадавікі адгрузкі

1. Лельчыцкі	—	100,1
2. Лагойскі	—	100,0
3. Заслаўскі	—	99,2
4. Талачынскі	—	82,2
5. Крычаўскі	—	81,3
6. Расонскі	—	77,9
7. Клімавіцкі	—	74,3
8. Аршанскі	—	74,1
9. Мсьціслаўскі	—	73,4

Зрываюць плян

1. Нараўлянскі	—	7,7
2. Кармянскі	—	8,2
3. Бешанковіцкі	—	9,4
4. Брагінскі	—	11,2
5. Сураскі	—	15,2
6. Чыр.-Слабодзкі	—	17,2
7. Старобінскі	—	18,1
8. Чэрвеньскі	—	23,5
9. Чавускі	—	25,1
10. Глускі	—	26,5
11. Капыльскі	—	27,4
12. Бальніцкі	—	27,9
13. Бабруйскі	—	28,8
14. Быхаўскі	—	28,9
15. Асіпавіцкі	—	29,8

Не адгрузілі ні аднэй тоны

ПЯТРЫКОЎСКІ
ТУРАЎСКІ

Самаабавязацельствы засталіся на паперы

ЦЕРАХАЎКА.

17 кастрычніка адбылася нарада ўсіх старшынь сельсаветаў, калгасаў і сакратароў сельскіх партыйных ячэек. Нарада ўзяла на сябе абавязак да 25 кастрычніка цалкам выканаць плян адгрузкі бульбы рабочым Ленінграду і арганізаваць чырвоны эшалён з бульбай у ліку 50 вагонаў.

На жаль, самаабавязацельствы засталіся нявыкананымі. Эшалён не арганізован. Адгрузка бульбы Ленінграду праходзіць самацёкам. У сярэднім штодзённа адгружаецца ня больш 5 вагонаў, што не дае ніякай гарантыі ў поўным выкананьні заданьня да 1 лістапада. Агульны плян адгрузкі па раёну выканан на 22 кастрычніка ўсяго на 44,7 проц. (БЕЛТА).

ХОД АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ

(у тысячах тон на 24 кастрычніка)

НАЗВА ЗАГАТОЎЧАЙ АРГАН.	ПЛЯН	Адгружана з пачатку кампаніі	Процант выкананьня
Белкаапшодагародніна	125	64129	51,3
Белплодагародніна	66	26000	38
РАЗАМ	191	90129	47,2

УЗБРОІЦЬ КАЛГАСНЫЯ МАСЫ АГРАТЭХНІЧНЫМІ ВЕДАМІ

Арганізаваць агратэх габінэты

Задача павышэньня ўраджаю і прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі бязумоўна патрабуе шырокага разгортваньня агратэхнічнай вучобы сярод рабочых саўгасаў, МТС і калгаснікаў. Тэхпропам Наркамзему Беларусі павінны быць распрацаваны канкрэтны зьмест і формы агратэхвучобы.

Самым спрыяючым часам для правядзеньня агратэхвучобы зьяўляюцца сьнежань, студзень, люты і сакавік месяцы. На працягу 4-х месяцаў павінна быць праведзена ўся асноўная работа на вывучэньні масамі тэхнікі саўгасна-калгаснай вытворчасьці. Трэба да 20 лістапада на месцах мець распрацаваныя праграмы для курсаў і агрэгурткоў. Неабходна забясьпечыць раёны вытарчальнай колькасьцю падручнікаў па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі, прыстасаваных да самастойнай прапрацоўкі саўгасна-калгасным актывам.

Да 1 сьнежня неабходна правесьці ў кожным сельсавеце 15-дзённыя курсы, на якіх прапрацаваць асноўныя арганізацыйныя пытаньні: арганізацыя і ўлік працы, арганізацыя сродкаў вытворчасьці (прамфін плян), арганізацыя паляводзтва, жывёлагадоўлі і іншых вядучых галін гаспадаркі.

Правядзеньне сельска-гаспадарчых курсаў-нарад у сельсавеце дасьць магчымасьць ахапіць увесь актыў-старшынь, членаў праўленьняў, калгасаў, брыгадзіраў, загадчыкаў фэрм і наогул актыву сельсавету. Дзякуючы набліжэньню сельска-гасапдарчых курсаў да мас, гэта дасьць магчымасьць сканцэнтраваць увагу працоўных мас на пытаньні аўладаньня тэхнікай у сельскагаспадарчай вытворчасьці. Апрача таго, курсы будуць працякаць непасродна ў саўгасе, буйным калгасе, дзе можна выкарыстаць гаспадарку, як аб'ект практычных заняткаў.

Да 1 сьнежня ў кожным саўгасе і калгасе неабходна арганізаваць агра-гурткі па вывучэньні саўгасна-калгаснай вытворчасьці. Непасрэдным кіраўніком гуртка павінен зьяўляцца брыгадзір. Дырэкцыі саўгасаў і праўленьне калгасу адказваюць за ўмовы заняткаў гурткоў.

Зараз, як ніколі, з усёй актуальнасьцю паўстае пытаньне аб арганізацыі агратэхгабінэтаў пры райвы. Неабходна прадугледзець па каштарысу на 1933 год сродкі на набыцьцё інструментарыі, бібліятэкі, плякатаў і інш.

Агратэхгабінэты павінны вакол сябе скапіцэнтраваць усю працу, уцягнуўшы ў работу ўсіх агранамаў, інжынэраў, тэхнікаў, лепшых ударнікаў, рацыяналізатараў, працаўнікоў навукова-дасьледчых устаноў і г. д.

Праз практычную работу агратэхгабінэтаў будзе ісьці зближэньне агратэхнічных кіруючых кадраў з калгаснікамі. Агратэхгабінэт зьявіцца рабочай майстэрняй і асяродкам барацьбы за ўкараненьне агратэхнікі і высокі ўраджай.

Агранам Васільеў П.

м. Крупкі.

На паперы... і на справе

ПУХАВІЧЫ. Барацьба за ўздым ураджайнасьці зьяўляецца цэнтральнай задачай сельскай гаспадаркі. Кожны ведае, што без аўладаньня агратэхнічнымі ведамі высокага ўраджаю не атрымаеш. З гэтай мэтай НКЗБ намеціў Пухавіцкі раён для правядзеньня вопытнай агра-тахвучобы. Адсюль вопыт будзе перадавацца ва ўсе раёны Савецкай Беларусі.

Для абгаварэньня гэтага пытаньня 21 кастрычніка пры Пухавіцкім райвы была склікана раённая нарада спэцыялістаў сельскай гаспадаркі. Вызначана рад канкрэтных мерапрыемстваў у напрамку арганізацыі агратэхвучобы.

Па плану, у Пухавіцкім раёне намечана стварыць каля 400 гурткоў. Пры кожным саўгасе, калгасе і спэцыялізаванай фэрме будзе арганізован агра-тэхгурток. У сельсавет ужо выехала 14 лепшых спэцыялістаў, якія возьмуцца за практычнае ажыцьцяўленьне пастаўленай задачы.

Стварэецца па раёне 14 пунктаў для правядзеньня вытворчых нарад. Праз гэтыя нарады будзе праводзіцца кіраўніцтва, інструктаж і штодзённая канкрэтная дапамога ў рабоце гурткоў. Пры МТС і моцных саўгасах нарады распачалі сваю работу.

Пры райвы арганізуецца агратэхгабінэт, які будзе даваць кансультацыю, групаваць увесь багаты практычны вопыт калгасаў і саўгасаў на павышэньні ўраджайнасьці. Пры габінэце ўстанаўліваецца дзяжурства спэцыялістаў.

Аднак... аднак трэба пажадаць, каб НКЗБ сваё мерапрыемства ажыцьцявіў не на словах, а на справе. Адна справа намеціць Пухавіцкі раён паказальным па агратэхпрапагандзе, зафіксаваць гэта ў пратаколе і зусім іншая справа ажыцьцявіць вызначаную мэту.

Першыя-ж дні паказалі, што НКЗБ свайго слова ня выконвае. Да сёньняшняга дня ня высланы праграмы і мэтадычныя распрацоўкі для гурткоў.

Бывалы.

На саломе зазелянела рунь

ВОРША.

У калгасе імя XIV партзьезду, Шыбіцкага сельсавету, пачалася малацьба. Абмалот паказаў, што капа жыта дае каля 0,7 цэнтн. збожжа.

Ніхто ўраджай тлумачыцца, па-першае, тым, што праўленьне калгасу на чале са старшынёй Васілёнкам Міколай ігнаруе агратэхнічныя мерапрыемствы. Ня ўведзен сеазваварот, нецаваляюча праводзіцца зяблева, ня ўжываюць радковую сяўбу, ня ўжываецца капка і г. д.

На-другое, не праводзіцца барацьба са стракамі ўраджаю. Да жнівняраж у часе ўборкі ня былі прыстасаваны зерніфуражнелі. Нядбайна была пастаўлена перавозка з поля ўраджаю.

На 10 кастрычніка абмалочана каля 150 пуд. жыта. Салома складзена на дваро безгаспадарча, зацякла ад дажджоў. Зьверху над саломай зазелянела рунь. Гэта ўзышло невымалачанае зерня.

Такога верня пасьля малацьбы ў саломе засталося 10-15 проц. У барабан падаваў член праўленьня Пінчук Міхась, які зацікаўлен быў, каб хутчэй толькі прапусьціць праз малатарню снапы, а на якасьць малацьбы не зварачаў увагі. Праўленьне калгасу на чале са старшынёй Васілёнкам Міканкам на гэту безгаспадарчасьць не рэагуе.

Урокі калгасу імя XIV партзьезду павінны быць улічаны ўсімі калгасамі Аршаншчыны. Укараняючы агратэхніку ў сельскую гаспадарку, трэба адначасова навучыць калгаснікаў правільна выкарыстоўваць с.-г.

У калгасе імя 14 партызан салома зазелянела ад прарослых зярнят

машыны з тым, каб зьвесьці да мінімуму страты пры ўборцы і малацьбе.

У часе зімовай вучобы трэба ўнесьці ў праграму агратэхгурткоў пытаньні аўладаньня тэхнікай складаных сельгасмашын.

Б. А.

ПЛЕШЧАНІЦЫ РЫХТУЮЦЦА ДА МІЖРАЁННАГА КАЛГАСНАГА КІРМАШУ

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Па тэлеф.). 22 кастрычніка адбылася нарада ўсіх сакратароў партыйных ячэек і старшынь сельсаветаў па пытаньні аб арганізацыі выезду калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на міжраённы калгасны базар.

Па лініі РВК і райкалгассаюзу даны ўказаньні ўсім сельсаветам аб разгортваньні масава-растлумачальнай работы па ўсіх населеных пунктах аб важнасьці калгаснага базару, які адбудзецца гэтымі днямі ў Менску.

Да 29 кастрычніка па ўсіх сельсаветах будуць праведзены сходы па пытаньні аб выніках верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б), шчыльна ўвязваючы гэта пытаньне з міжраённым калгасным базарам.

Па Зарэцкім сельсавеце ўжо вывешаны абвесткі па ўсіх населеных пунктах аб днёх кірмашу. Члены гэтага сельсавету праводзяць гутаркі па гэтым пытаньні па ўсіх калгасах і вёсках.

Абгаварыўшы пытаньне выезду на міжраённы калгасны базар, калгаснікі калгасу «Новае жыцьцё», Зарэцкага сельсавету, аднадушна ўхвалілі вывезьці на рынак на 300—400 руб. рознай сельска-гаспадарчай прадукцыі (мяса, малака, масла, бульба, гародніна і інш.).

Местачковая кравецкая арцель «Свая праца» абавязалася вывезьці на рынак на 2 тыс. руб. тавараў шырокага ўжытку (коўдры, штаны, жакеты, бялізну, плашчы і шапкі).

МОДЛІК.

22,3 проц.—вельмі мала

Сіроцінскі раён зьяўляецца адным з рашаючых раёнаў па выкананьні рэспубліканскага пляну адгрузкі бульбы Ленінграду.

Між тым, становішча з адгрузкай на 22 кастрычніка пагражаючае. Усяго адгружана 1.055 тон, ці 22,3 проц. данага заданьня. Узрост за апошнюю дэкаду складае ўсяго 3,8 проц.

Зусім недапушчальна праходзіць адгрузка бульбы па сыстэме райспажыўсаюзу. З 1.750 тон райзагатовак адгружана на 22 кастрычніка ўсяго 559 тон—31,4 проц. заданьня.

Каб выканаць плян адгрузкі да 1 лістапада, патрэбна кожны дзень адгружаць 120 тон. У сапраўднасьці-ж райзагатовак ня выконвае штодзённага заданьня. У апошнія дні не адгружана ні аднэй тоны.

Л. Ш.

АБ ПЕРАВЫБАРАХ БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ і ЯЧЭЕК ВНУ, ВТНУ і ТЭХНІКУМАЎ

Пастанова бюро Менскага ГК КП(б)Б

Заслухаўшы інфармацыю арганізэлу ГК аб перавыбарчай кампаніі бюро ячэек ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў у сувязі з новым навучальным годам, бюро Менскага ГК КП(б)Б пастанаўляе:

1) Перавыбары бюро партколектываў, ячэек ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў правесьці як палітычна-масавую кампанію, сканцэнтраваўшы ўвагу на мабілізацыю мас студэнцтва і навуковых працаўнікоў на барацьбу за якасны рост ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў, за якасьць вучобы, за канкрэтнае ажыцьцяўленьне пастановы ЦВК БССР аб вышэйшай школе.

2) Перавыбарную кампанію правесьці да 10-га лістапада г. г.

3) Арганізаваць пасьпяку 10 аргпартгруп для дапамогі ў перабудове партыйна-масавай работы і правядзеньні перавыбарчай кампаніі.

4) Даручыць арганізэлу напісаць інструкцыйны ліст да ўсіх ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў па пытаньні перавыбараў бюро ячэек.

5) Абавязаць рэдакцыі газэт «Зьвязда» і «Рабочий» уключыцца і дапамагчы ў правядзеньні перавыбарчай кампаніі.

6) Даручыць арганізэлу распрацаваць каляндарны плян перавыбараў бюро партколектываў, ячэек ВНУ і тэхнікумаў і забясьпечыць прадстаўнікоў ГК на перавыбарах.

7) Вынікі перавыбарчай кампаніі паставіць на бюро ГК.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б — ШПЭКТАРАЎ.

Рэдакцыям газэт „Зьвязда" і „Орка", Наркамзему і Калгасцэнтру

РАПАРТ

Пад кіраўніцтвам партыі, па-бальшавіцку змагаючыся за выкананьне палітычна-гаспадарчых кампаній, на аснове арганізацыі працы, сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, саўгасы, калгасы і працоўныя аднаасобнікі Дзяржынскага раёну 25 кастрычніка скончылі ўборку бульбы і перакліканчаюць цягавую сілу на выкананьне пляну зяблёва.

Нам. загадчыка райза КУРГАНАЎ.

Старшыня райкалгассаюзу АТАХЛЬ

МІТЫНГ-ПЕРАКЛІЧКА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ і АРЦЕЛЯЙ ПА ШЫРСПАЖЫВЕ

Максымальным пашырэньнем уцільцэхаў дамо калгаснаму рынку БОЛЬШ ДОБРАЯКАСНАЙ ПРАДУКЦЫІ ШЫРСПАЖЫВУ

ЗАМАЦАВАЦЬ ПЕРШЫЯ ПОСЬПЕХІ, ПАШЫРЫЦЬ РАБОТУ УЦІЛЬЦЭХУ

Завод імя Ланцуцкага (Гомель) мае надзвычай многа розных адкідаў вытворчасьці. Тут і лом розных металяў, і абрэзкі бляхі, і дрэўляныя каналы. Доўгі час гэтыя каштоўныя адкіды зусім не скарыстоўваліся, за гражаджалі сабой двор і заводзкі двор.

Пасьля ўказаньня партыі і ўраду аб разгортваньні выробу тавараў шырспажыву, заводзкія арганізацыі вызначылі мерапрыемствы па скарыстаньні каштоўных адкідаў для выробу розных рэчаў масавага спажываньня. Вырашана было арганізаваць уцільцэх.

Першыя дні работы уцільцэху прайшлі ў абставінах напружанай барацьбы з рознымі непаладкамі арганізацыйнага і тэхнічнага парадку. Недахват рабочай сілы і абсталяваньня зьявіліся першымі перашкодамі. Па крыху адсюль зносілася ў цэх абсталяваньне, адзін за адным вербаваліся рабочыя, частка рабочых перайшла з іншых цэхаў.

Тры месяцы існаваньня цэху — гэта кароткі і разам з тым вялікі пэрыяд, за які рабочы калектыў правёў напружаную барацьбу за дадатковы выпуск шырспажыву. Ліпеньскі прамфінплян уцільцэх выканаў усяго на 26 проц. Выпушчана прадукцыі на суму 2.359 руб., замест вызначаных па заданьні 8.740 руб. Гэта быў час, калі ў цэху панавала поўная абязьлічка. Ня было пастаянных намётак што выпускаць, не хапала рабочых і абсталяваньня. Апрача таго, група клясава-варожых элемэнтаў на чале з памочнікам майстра **Лебедзевым**, якія выпадкова папалі ў цэх — разлагалі рабочых і вялі падрыўную, дэзарганізатарскую работу.

Супроць гэтай, па сутнасьці, антысавецкай зграі актыўна выступілі лепшыя ўдарнікі-энтузіясты. Трэба асабліва адзначыць работу пэхавай пяцідзённай пасьцянгазэты **«За работу па-новаму»**, якая зьявілася ў сьвет з першых дзён арганізацыі цэху. Яна вяла непрымірымую барацьбу з зрыўшчыкамі прамфінпляну, лятунамі, прагульшчыкамі рвачамі. З дапамогай рабкораў ёю была выкрыта падрыўная работа **Лебедзева** і яго кампаніі.

Дзякуючы шырокай масавай рабоце па растлумачэньні пастаноў партыі і ўраду сярод рабочых ужо ў жніўні рэзка ўзьнялося выкананьне прафінпляну. Вытворчае заданьне жніўня цэхам выканана на 97,6 проц. Яшчэ лепшыя вынікі даў верасень, **прамфінплян якога выкананы на 106 проц., выпушчана на 10.340 руб. прадукцыі.**

Такая кароткая гісторыя уцільцэху заводу імя Ланцуцкага. Што вырабляе гэты цэх? Розныя неабходныя прылады для сельскай гаспадаркі і часткова для гораду. У цэху працуе зараз 48 рабочых, якія разьбіты на брыгады. Сьлесары і токары вырабляюць з мэталёвага лому граблі, жалезныя вілкі, падосікі, утулкі для калёс. Бондары з дубовых і сасновых адкідаў ад вырабу вагонаў — бочкі і балеі. Брыгада сталяроў скарыстоўвае дрэўляныя адкіды для вырабу шафаў, этажэрак, сталоў і інш. мэблі. Бляшанікі з абрэзкаў бляхі робяць вёдры, умывальнікі, лейкі. Вось асартымэнт вырабаў.

Але ў галіне вызначэньня асартымэнту спачатку былі нематорныя труднасьці. Трэба было выбраць такі асартымэнт, які найбольш патрэбен масаваму вясковаму спажыўцу. **Для гэтай мэты брыгады рабочых выяжджалі ў паўночны калгас і правялі там некалькі сходаў калгасьнікаў, на якіх абгаварылі, што найбольш неабходна ім зараз з прамысловых тавараў.** Калгасьнікі выказалі сваю думку. Дзякуючы мерапрыемства прыпесла шмат карысьці. Зараз уцільцэх, улічыўшы запатрабаваньні сялян, пачаў выраб імення тых рэчаў, якія найбольш патрэбны ў сельскай гаспадарцы.

Было-б няправільна, калі-б мы не сказалі пра недахопы работы цэху. Сапраўды, ці скарыстоўваюцца на гэтым заводзе ўсе магчымасьці, усе ўнутраныя рэсурсы вырабу шырспажыву? Далёка ня ўсе. Для такога заводу, як імя Ланцуцкага, уцільцэх, у якім працуе ўсяго 48 рабочых, бязумоўна, ня можа пераапрацаваць усе рознастайныя адкіды вялікага заводу. Таму першачарговая задача кіраўніцтва заводу ў тым, каб неадкладна пашырыць цэх.

Другая задача — пашырыць памяшканьне цэху. Да гэтага часу цэх зьмяшчаецца ў вельмі малым і цесным памяшканьні. Тут працуюць брыгады сталяроў, токараў, бляшаньнікаў і бондараў. Адны перашкаджаюць другім. Трэба сур'ёзна падумаць над вызначэньнем для цэху больш прасторнага памяшканьня за лік іншых цэхаў, ці пабудаваць новае. Вопыт, які ўжо ёсьць на заводзе ў галіне наладжаньня работы уцільцэху, трэба скарыстаць для далейшага разгортваньня выробу тавараў шырспажыву.

Ю. БЯЛЬКО.



Выраб тавараў шырспажыву на гуце імя Донбаля (Барысаў)

Ператварыць дрыўляныя адкіды ў рэчы хатняга і гаспадарчага ўжытку

Лясная гаспадарка мае невыстарчальныя запасы дрыўляных адкідаў—сырцу для выробу прадметаў шырокага ўжытку. У лясох, на прыстанёх, складах і лесазаводах гніюць сотні тысяч кубамэтраў драўніны, якую можна было-б скарыстаць на выраб вобадоў і сьніц для колаў, тары, рознай мэблі, кровельнага матар'ялу (гонта) і выпальваньне дравеснага вугалю.

На справе-ж гэтага ня робіцца. Большасьць кіраўнікоў леспрамгасаў яшчэ і да сёньняшняга дня апартуністычна не даацэньваюць гаспадарча-палітычнай важнасьці шырспажыву. Пад рознымі соўсамі яны імкнуцца адчаніцца ад гэтага важнейшага мерапрыемства. Няма, маў, спэцыялістаў, памяшканьня для ўцільцэхаў, не хапае рабочай сілы і інш.

Слуцкі леспрамгас, напрыклад, атрымаўшы заданьне ад Лесбелу на чацьверты квартал, даслаў у трэст дакладную запіску: «Ставім вас у вядомасьць, што ў нас няма зараз памяшканьня для ўцільцэху, адсутнічаюць майстры. Просім дазволіць перадаць запасы сырцу (адкідаў) мясцовым арцелям **Лесдазўхзмасаюзу**, а ад іх мы можам атрымаць гатовую прадукцыю». Лепшае, што прыдумалі слуцкія гора-кіраўнікі,—перадаць сырец і атрымаць гатовую прадукцыю (сані і цялежкі).

Значная частка леспрамгасаў пайшла па лёгкім вайменшага супраціўленьня. Замест разгортваньня выробу прадметаў шырспажыву, узяліся за рэалізацыю прадукцыі, якая толькі была на складах.

Зразумела, што пры такім захапленьні рэалізавана прадукцыя, якая зараз патрэбна для нашых прадпрыемстваў. Трэст «Лесбел» ня даў належнага адпору свавольству значнай часткі леспрамгасу і не мабілізаваў грамадзкасьць на сапраўдную барацьбу за шырспажыў.

Арганізацыя ўцільцэхаў па леспрамгасах, па сутнасьці, правалена. Па БССР налічваецца звыш 50 леспрамгасаў, але ўцільцэхі створаны толькі ў 6: **Рэчыцкім, Быхаўскім, Бельніцкім, Дубровенскім, Гомельскім і Магілёўскім.**

Ня так даўно спэцыяльна па арганізацыі ўцільцэхаў трэстам выскалася брыгада з 8 адказных работнікаў трэсту. Між тым, прыкметнага зруху ў палепшэньні работы па шырспажыву брыгада ўсё-ж не зрабіла.

Для кіраўніцтва работай па шырспажыву ў трэсьце вылучан адказны работнік тав. **Сагаловіч**, але ён ня водае, што робіцца на мясцох у гэтым напрамку, які асартымэнт шырспажыву вырабляюць леспрамгасы і г. д.

Па дырэктыве Наркамлесу СССР, леспрамгасам Беларусі дано ўказаньне вырабляць з адкідаў у трэцім квартале кровельны матар'ял (гонта), абозныя камплекты (сані, павозкі, колы і інш.) і выпальваць дравесны вугаль. Між тым, які асартымэнт і колькі вырабілі леспрамгасы—адказны за шырспажыў работнік трэсту т. **Сагаловіч** ня ведае.

Жыкое, канкрэтнае і апэратыўнае кіраўніцтва з боку трэсту работай шырспажыву адсутнічае.

Яно падмяняецца цыркулярнымі. Зразумела, адномі толькі цыркулярамі работы з месца ня зрушыш.

Самацёк у рабоце, бязумоўна, адбіўся і на выкананьні праграмы. Заданьне трэцяга кварталу па шырспажыву трэстам выканана толькі на 86 проц.

Да вызначэньня праграм леспрамгасам на чацьверты квартал Лесбел падышоў чыста фармальна. Ня ўлічаны магчымасьці кожнага леспрамгасу і ў адпаведнасьці з гэтым ня вызначан асартымэнт вырабу.

Трэба адзначыць, што большасьць партыйных і прафсаюзных арганізацый леспрамгасу ня стала на чале арганізацыі ўцільцэхаў, не мабілізавала работную грамадзкасьць на пасьпяховае выкананьне праграмы па шырспажыву.

Мітынг-пераклічка прадпрыемстваў і арцеляй па шырспажыву, які зараз праводзіцца, абавязвае Лесбел і кіруючыя арганізацыі леспрамгасаў дабіцца рашучага пералому ў арганізацыі ўцільцэхаў, з тым, каб поўнасьцю скарыстаць адкіды на выраб розных прадметаў, хатня-гаспадарчага ўжытку.

Т—на.

Заваяваць пераходныя сьцягі

Плян мабілізацыі сродкаў па БССР за трэці квартал выканан на 102,9 проц., а з уліскам паступленьняў па самаабкладаньні на 108,8 проц. Па добраахвотных-жа пляцяжох плян выканан толькі на 72 проц., з якіх па гораду 81,4 проц. і па вёсцы 31,8 проц.

Пездавальняючы ход рэалізацыі пазыкі «4-га завяршальнага году пяцігодкі». Кантрольная лічба выканана на 73,7 проц. Зусім ганебныя паказальнікі па ўкладах у ашчаджасу, плян выкананы толькі на 38 процантаў. Слабое выкананьне на спажыўкаапэрацыі — 79,5 проц. і па аграмаджаным сэктары — 85,1 проц.

Перадавымі раёнамі БССР па выкананьні фінпляну зьяўляюцца Менскі, Віцебскі, Заслаўскі, Жыткавічкі, Мсьціслаўскі і Сіроцінскі, якія на працягу 3-х кварталаў праводзілі бальшавіцкую барацьбу за плян.

Адстаюць Веткаўскі, Бярэзінскі, Глускі, Казянскі, Лоеўскі і Асьвейскі раёны, якія на працягу 1932 году чарапашымі тэмпамі вялі працу па мабілізацыі сродкаў і ня выканалі пляну ў 3-м квартале.

Прэзыдыум ЦСПСБ надаў вялікае значэньне гэтаму пытаньню і сваёй апошняй пастановай абавязаў усе ЦП саюзаў і гарпрафсаветы безадкладна ўключыцца ў агітмасавы фінансавы паход, які арганізуецца пад лёзунгам: **«да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выканаем ня менш 50 проц. пляну 4-га кварталу».**

ЦП саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю павінна прыняць рашучыя меры да ліквідацыі прарываў у выкананьні фінпляну па спажыўкаапэрацыі і сыстэме Дзяржгандлю.

Задача гарпрафсаветаў зьвярнуць асаблівую ўвагу на актывізацыю прафсаюзных арганізацый у справе распаўсюджаньня пазыкі «4-га завяршальнага году пяцігодкі», увязаўшы гэту працу з шэфскай работай пры правядзеньні масава-палітычнай падрыхтоўкі да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У сувязі з дрэннай работай апарату апчад кас прапанавана райпрафсаветам узмацніць кантроль над працай гарадзкіх і раённых апчадкас, аказваючы ім пастаянную практычную дапамогу ў выкананьні ўкладзеных на іх абавязкаў.

Прэзыдыум ЦСПСБ папярэджвае **Кармянскі, Веткаўскі, Бярэзінскі, Глускі, Лоеўскі і Асьвейскі** райпрафсаветы, што калі ў бліжэйшы час ня будзе зроблен пералом у мабілізацыі мас на выкананьне фінансавых задач, то будуць прыняты рашучыя меры да старшынь райпрафсаветаў, як навыконваючых дырэктывы партыі ў справе мабілізацыі фінансавых сродкаў.

Тыя раёны, якія ажыцьцяўляць на справе пастановы партыі і вышэйшых прафарганізацый і да XV гадавіны Кастрычніка з посьпехам выканаюць 50 проц. фінпляну чацьвертага кварталу, атрымаюць пераходныя сьцягі імя ЦСПСБ, Наркамфіну БССР і ЦП саюзу ФБР.

Усе прафсаюзныя, фінансавыя, савецкія і каапэрацыйныя арганізацыі, усе ўдарнікі фінансавага фронту павінны мабілізаваць свае сілы на барацьбу за 50 проц. выкананьне фінпляну да XV гадавіны Кастрычніка, каб атрымаць гаворавае права рапартаваць аб перамогах.

Ф-ў.

Гарбарнікі па-баявому змагаюцца за плян чацьвертага заключнага

ПЛЯН ПЕРШАЙ ПЯЦІГОДКІ ВЫКАНАН

Трыкутнік, рабочыя і інжынэрна-тэхнічныя работнікі Віцебскай гарбарні, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, выконваючы шэсьць умоў тав. Сталіна, 24 кастрычніка плян чацьвертага, заключнага году пяцігодкі выканалі на 109,9 проц.

10-месячны сустрэчны плян выканан дзяржпрыёма на 100,8 проц. 10-месячны плян па прадукцыі шырспажыву выканан дзяржпрыёма на 104,7 проц.

Кастрычніцкі плян за 22 дні выканан на 103,7 проц., па шырспажыву — на 121,9 проц.

Дырэктар заводу ЛІПНІЗЭР.
Сакратар партканфліктыву ВАХРАХ.
Старшыня заўкому ВАЙНШТЭЙН.

Рапарт перамогі

ЦК і Менгаркому КП(б)Б, ЦСПСБ і Менгарпрафсавету, СНК і Наркамлёгпраму

Менская чырвонасьцяжная гарбарня «Большавік», дзякуючы дабрай падрыхтоўцы да XV гадавіны Кастрычніка, на 10 дзён раней тэрміну скончыла выкананьне дзесяцімесячнага праграмнага заданьня, у кажэвасьці на 100,2 проц., у цэнасьці — на 100,8 проц. Рабочы калектыў гарбарні змагаецца за выкананьне астатніх абавязацельстваў, узятых на сябе ў адказ лемінградскім рабочым, і ўжо мае рад посьпехаў. 13 лепшых ударнікаў уступілі ў партыю. Продукт ударнікаў даходзіць да 92, замест 86 на 1 верасьня. Паступілі 32 рацыяналізатарскія прапановы, 82 проц. усіх рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу заангажаваліся да канца другой пяцігодкі. Арганізаваны яшчэ дзьве гаспадарча-разрахунковыя брыгады. Скончана абсталяваньне новай сталёўкі, адкрыцьцё якой прыстасоўваецца да Кастрычніцкіх сьвят.

Дзякуючы дапамозе рабочага калектыву, заводзі пачынае з посьпехам скончыў уборку бульбы. Гарбарня «Большавік» першая ў БССР прыступіла да складаньня тэхграфіка плану на 1933 год.

Мы ўпэўнены ў тым, што на асляблянасьці барацьбы, ударны калектыў гарбарні, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, даб'ецца пра ва рапартаваць ЦК КП(б)Б аб пасьпяховым скончэньні плану чацьвертага, заключнага.

Сакратар партканфліктыву ГЕЛЕР.
Дырэктар заводу БАНДАРЧЫК.
Старшыня заўкому ВАЙЧУК.

***

ЦК і магілёўскаму РК КП(б)Б, раёнцыям газэт „Зьвязда" і „Камунар Магілеўшчыны", ЦСПСБ, Наркамлёгпраму і Белскураб'яднаньню

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК КП(б)Б, райкому і партканфліктыву калектыў ударнікаў — рабочых, ІТР і служачых магілёўскай гарбарні імя Сталіна 15-га кастрычніка, у 4 гадз. дня дзяржпрыёма выканаў вытворчую праграму за 10 месяцаў на 102,6 проц.

За першыя 15 дзён кастрычніка, месячны прамфінплян выкананы на 52,5 проц.

Прамфінплян выканан ударным калектывам заводу на аснове рэгулятыўнага сацыялістычнага і ўдарніцтва і барацьбы за рэалізацыю 6 гістарычных указаў тав. Сталіна, за права рапарту ЦК КП(б)Б, за перамога ва ўсебеларускай вытворчай пераклічцы.

Калектыў рабочых, ІТР і служачых заводу імя Сталіна запэўнівае ЦК і РК КП(б)Б, што будзе змагацца далей і даб'ецца посьпяховага скончэньня праграмы 4-га заключнага году пяцігодкі па ўсіх показальніках.

Дырэктар заводу — ГЕФЭН.
Сакратар партканфліктыву—ГОЛЬДЗІН
Старшыня заўкому ШМІДАЎ.

Да адказнасьці валакітчыкаў

Гомельскі машына-будаўнічы завод «Пралетары» выконвае адказнейшыя заказы ўсесаюзнага значэньня для чорнай мэталюргіі. Зусім зразумела, што гэтыя заказы могуць быць выкананы ў тэрмін толькі пры ўдарных напружаных тэмпах работы ўсяго рабочага калектыву, пры ўмове бесперабойнага забесьпячэньня заводу сырцом, апаламі і г. д.

Дапамагчы заводу ў першую чаргу павінна Белмэталяб'яднаньне і інш. арганізацыі, якія непасрэдна адказваюць за своячасовае стабільнае і дастаўку запаражнага сырцу. Аднак, на справе мы маем зусім іншае становішча.

Знаходзяцца галавацяпы, якія ня толькі не дапамагаюць заводу з гонарам выканаць баявы заказ, а сьвядома зрываюць яго работу. Спынімся на адным факце, які заслугоўвае самага рашучага асуджэньня.

Для выкананьня праграмы ў кастрычніку Гомельскаму заводу «Пралетары» патрэбна 50 тон коксу, які запаражнае Белдзяржспаабыту Пяскоўскі засыпае грузы, прызначаныя па разнарадках Гомелю, у Менск.

Так, Пяскоўскі, запаражнае 2 вагоны коксу для заводу «Пралетары» з указаньнем у дублікатах за №№ 19.681 і 19.683 коспа знаходжаньня заводу ў Гомелі, а стацыю прызначэньня—Менск.

12 кастрычніка 2 вагоны коксу спакой на прайшлі міма гомельскага заводу «Пралетары» і 13 прыбылі ў Менск... па прызначэньні для Гомелю.

Белмэталяб'яднаньне, як толькі даведалася пра гэты абураючы факт, зараз-жа паведаміла адказных працаўнікоў Саюзтрансу Зальсовіча і Шэйда, а таксама касіра тавар ных дошак. У некаторых ёсьць нават няправільнае прадстаўленьне аб ролі чырвоных і чорных дошак у бальшавіцкім друку. «Штурмавец Дзяржынчыны» ў № 81 ад 22 верасьня зьмясьціў на чырвоную дошку кулакоў. Ясна, што тут факт скажэньня ленінскага вучэньня аб друку, аб ролі чырвонай і чорнай дошак.

Некаторыя нашы газэты яшчэ не навучыліся захоўваць сьвятло і цень, давяць матар'ял, як «заштурхоўваючы», так і «прыцягваючы».

На пытаньне ў рэдактара лагойскай райгазэты ў часе весенняй пасэўнай кампаніі: «Чаму ў цябе ўсё аб дрэнным, нічэго-ж няма ў рабоце аднаго калгасу, брыгады, якія маюць посьпехі?» — ён адказвае: «Затое, ў мяне ў наступным нумары будзе выключна аб добрым».

Зразумела, такі падыход можа толькі дэзарганізаваць нашу работу. Хіба-ж у Лагойску ўсё было толькі дрэннае, і раптам усё стала добра? Ніякова не. Справа ў тым, што рэдакцыя ня здолела даць правільны аналіз становішча раёну. Трэба ўмець пільнаваць ацэнку становішча. Гэтага можна дасягнуць толькі тады, калі газэта ня будзе жыць на самацёку. Прыбываюць селькоры, якія пішуць аб дрэнным, тады газэты пішуць аб добрым, прыбываюць аб дрэнным, тады... чакаюць, пакуль жывыя прыклады новага трапяць самі ў рэдакцыю. Ня весьці адпаведнай арганізацыйна-масавай работы — значыць не разумець сутнасьці бальшавіцкага друку.

Асьвейская газэта (пры старым кіраўніцтве), задумала дань прыкладны плян размеркаваньня ўраджаю. Сама ідэя, зразумела, вельмі капітальная і неабходная. Але што-ж газэта для гэтага зрабіла? Першую пашпўную заметку аб размеркаваньні ўраджаю яна дала як прыклад для ўсіх калгасаў. А ў выніку выявілася, што гэты калгас зусім не зьяўляецца перадавым, тыповым для раёну. Зразумела, што такім показам можна толькі навадзіць. Гэты ўрок павінны ўлічыць пры показе герояў пяцігодкі. Трэба спусьціцца ў завод, у калгас, у брыгаду, вывучыць работу перадавікоў, выяўляць сапраўдных герояў, арганізоўваць на гэту справу шырокія масы рабселькораў, піснды друк. На старонках нашага друку павінны быць показаны сапраўдныя героі, якія заслугоўваюць гаворавай назвы «героя пяцігодкі», у якіх ёсьць у сапраўднасьці чаму павучыцца, па якіх трэба раўняцца.

Трэба выкрываць такога роду думкі, «што гэта за геройства, калі выконвае і перавыконвае плян, ня мае прагулаў».

Мы тут закранулі задачы газэт, але ў нашым арсэнале шырокія, неабмежаваныя магчымасьці папулярызаваць герояў. Літаратура, кіно, тэатры, фота, плякаты, масавыя сходы — усё павінна быць скарыстана для показу сваіх герояў. Такія пачынаньні ўжо ёсьць. Фота-вітрыны ўдарнікаў у пасобных клюбах-кіно зачэпілі прыцягваюць усеагульную ўвагу мас. Мастацкія самадзейныя гурткі на заводах, фабрыках павінны показаць сваіх ударнікаў. Пісьменныя павінны першыя адгукнуцца на заклік віцебскіх кансамольцаў.

Наша краіна напярэдадні пятнаццатай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. За гэты 15 год упісана ня мала бліскучых старонак адвагі і геройства пралетарыяту і працоўнага сялянства Савецкага саюзу.

Багаты ні адно пятнаццацігодзьдзе ў гісторыі не багата такімі паказамі, геройскімі ўчынкамі, як наша сацыялістычнае пятнаццацігодзьдзе. На арэну выступіла кляса, якая прыняла ажыцьцяўляць тое, аб чым марыла і за што змагаліся лепшыя розумы чалавецтва — за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Першая пяцігодка выхавала, загартавала на мала сапраўдных энтузіястаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Показам гэтых герояў, на іх прыкладах будзем выхоўваць ПАДРАСТАЮЧАЕ ПАКАЛЕНЬНЕ.

Г. ФУКСОН

Показам герояў гераічнае клясы

КАМСАМОЛІЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ выступіла з прапановай, каб у сувязі з XV гадавінай Кастрычніка арганізаваць ушанаваньне герояў пяцігодкі. Ужо на радзе фабрык і заводаў многіх гарадоў падхоплен пачын Віцебску. Пачынаюць выяўляць тых, для якіх праца стала «справай гонару, справай адвагі і геройства».

Пачын Віцебску заслугоўвае шырокай увагі і падтрымкі ўсіх арганізацый і ў першую чаргу вашага друку, пачынаючы з цэнтральных газэт і канчаючы пізавымі.

Шмат ёсьць у нас бязіменных герояў, якія показваюць узоры сацыялістычных адносін да працы, якія пацьвярджаюць справай, чаго можа дасягнуць чалавецтва пры вызваленьні ад капіталістычнага рабства.

Гэтыя імёны павінны быць рассьмярчаны. Іх вопыт і мэтады работы павінны стаць здобыткам мас.

Пяцігодка паралела новы тып героя. На арэну выступіў ударнік. Само слова «ударнік» прыводзіць у жах клясовых ворагаў. Колькі шкоднікаў, колькі шмыгаў, бруду вылета прыпнянтаў капіталізму — бандытаў шпіра, каб ачарніць перад міжнародным пралетарыятам ударніцтва.

«Прымусовая праца, дэмпінг», — закрычалі разьюшныя і разам з тым спалоханыя перажыткі пралетарыяту СССР, сусьветныя імперыялісты. Гэта яны — у якіх мільёны рабочых выкідваюцца на вуліцу, панюць галоч і голад — сталі дабрачынцамі і «абаронцамі» савецкіх рабочых.

Наперакор брэхням, Блюмам і Абрамовічам, наперакор ударніцкім апартуністам,— ударніцтва стала фактарам сусьветна-гістарычнага значэньня. Ударнік стаў цэнтральнай фігурай сацыялістычнай вытворчасьці.

Дзе прычыны такога магутнага разьвіцьця сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, нараджэньня мільёнаў герояў сацыялістычнае працы?

Толькі тая кляса, якая мае вялікую будучыню, багацьце перспэктыў, якая працуе на сябе, можа і здольна на такі рост вытворчасьці, прабуджэньне ініцыятывы, выяўленьне талянтаў, як рабочая кляса Савецкага саюзу.

Энтузіязмам пяцігодкі жыве ня толькі рабочая кляса. Са шматмільённай масы сялян, якія сталі на сацыялістычны шлях, вырастае мноства герояў пяцігодкі. Колькі сапраўдных энтузіястаў сацыялістычнай працы выхоўваюцца ў калгасной вёсцы!

У барацьбе з клясавым ворагам за моцны калгас, за выкананьне пляну загатовак, загартоўваецца, расьце сьвядомасьць калгасніка сялянства. Павялічваецца лік людзей, пачынаючых жыць ня толькі сваімі інтарэсамі, свайго калгасу, але інтарэсамі раёну, рэспублікі, усёй пралетарскай дзяржавы.

Хіба мала фактаў, калі перадавыя калгасы, брыгады бяруць на буксір адстаючых, дапамагаюць ім у рабоце?

Геройныя прыклады рабочых Днепрабуду, Магнітабуду, перадавых фабрык і заводаў заражаюць калгаслую вёску. Водгукі канкрэтнымі мерапрыемствамі на ліст рабочых Ленінграду — яркі показальнік росту энтузіязму ў горадзе і ў вёсцы.

Асабліва яркі відаць прабуджэньне творчай ініцыятывы мас ва ўмовах БССР, былой калёніі царскай Расіі.

Рост ударніцтва ў Савецкім саюзе — рост сілы міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

Зусім зразумела, што пры капіталістычным спосабе вытворчасьці некаторыя паваг і марыць аб разьвіцьці такога творчага энтузіязму, праяўленьня геройства, што ёсьць у нас.

Буржуазны друк выхваляе сваіх герояў — Форлаў, Гуваў, прадстаўляючы іх, як ратавальнікаў чалавецтва; наладжваюцца трыумфы ля магілы «невядомага салдата». Але масы ўсё больш пераконваюцца, якая цана гэтым героям голаду.

Для якой мэты ствараюць гэтыя трыумфы?

Буржуазія прабуе стварыць мнімых герояў. Крыкамі аб «буме», хоча аслабіць уплыў сусьветнага крызісу, які ўсё паглыбляецца.

Наша сапраўднасьць не адчувае патрэбы ў прыфарбоўваньні. Тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР — жывы прыклад баяздольнасьці пралетарыяту. Нам няма чаго ствараць мнімых герояў.

Але трэба проста сказаць, што нашы пізавыя арганізацыі яшчэ ня ўсё зрабілі, каб выявіць, показаць сапраўдных герояў сацыялістычнага будаўніцтва, іх работу, якім чы нам яны дасягнулі высокіх показальнікаў, — показаць так, каб зараз жа прыклады мас. У свой час нашы цэнтральныя газэты «Зьвязда» і «Рабочай» разгарнулі показ брыгады каменшчыкаў Дворкіна і брыгады тарфяшчыкаў Кавэрда. Гэтыя брыгады сталі вельмі папулярныя ў рабочых масах.

Кавэрда і Дворкін сталі папулярнымі таму, што кожны каменшчык, тарфяшчык бачыў пэрспэктыву — стаць у рады з імі, бо Дворкін і Кавэрда рабілі нашу агульную справу. Прыз умелы показ іх мэтадаў работы, штодзённая ўвага заражала масы рабочых.

Па прыкладу цэнтральных газэт арганізавалі показ герояў газэты **«Віцебскі пралетарый», «Палесская праўда».** Ня дрэнна показала ў часе весенняй сяўбы ударнікаў палёў і Чырвона-слабодзкая райгазэта **«Калгасьнік».**

Аднак, наш друк, асабліва раённы і пізавы яшчэ не разгарнуў сыстэматычнага показу сапраўдных герояў пяцігодкі, іх будняў.

Вучыць масы на жывых прыкладах, перапосіць вопыт перадавікоў на адстаючыя вучасткі — вось неадкладная баявая задача нашых газэт.

Ленін у сваім артыкуле «Вялікі пачын» сказаў, што «Наша прэса мала клапоціцца, або зусім не клапоціцца аб тым, каб апісваць найлепшыя сталоўкі ці яслі, каб дзённымі намаганьнямі дабівацца пераўтварэньня некаторых з іх ва ўзорныя, каб рэкламаваць іх, апісваць падрабязна, якая эканомія людзкой працы, якія выгады для спажыўцоў, якое выбаражэньне прадуктаў, якое вызваленьне жанчыны ад хатняга рабства, якое паляпшэньне санітарных умоў дасягаецца пры ўзорнай камуністычнай рабоце, можа быць дасягнута, можа быць распаўсюджана на ўсё грамадзтва, на ўсіх працоўных». Гэта ўказаньне Леніна зьяўляецца дырэктывай для нашага друку і на сёньняшні дзень. Ленін падрабязна апісваць, рэкламаваць, штодзённымі настойваньнямі дабівацца пераўтварэньня ва ўзорныя нашых сталовак, яслей і г. д.

Гультая, прагульшчыка ў нас часамі на некаторых заводах больш вешаюць чым ударніка. Нашы газэты пішуць і аб добрым, але рэдка, як пішуць, якасьць матар'ялу. Звычайна пішуць, што вось такі завод, калгас выканаў плян, дабіўся дасягненьняў, але як яны выкананы, дзякуючы чаму, хто гэтыя людзі, іх імёны, іх мэтады работы — гэтага няма, або вельмі няма. Часамі людзі зусім не ўспамінаюцца, а проста — завод, калгас.

Нашы газэты часта канстатуюць становішча, але не прасякаюць у глыбіню жыцьця, не даюць аналізу тым фактам, аб якіх пішуць.

Чырвоныя і чорныя дошкі — важнейшыя сродкі па выкананьні мас, па стварэньні грамадзкай думкі вакол перадавікоў, на падтрымліваньні адстаючых. Аднак, не ва ўсіх яшчэ паглядаюцца сур'ёзныя адносіны на дошак. У некаторых ёсьць нават няправільнае прадстаўленьне аб ролі чырвоных і чорных дошак у бальшавіцкім друку. «Штурмавец Дзяржынчыны» ў № 81 ад 22 верасьня зьмясьціў на чырвоную дошку кулакоў. Ясна, што тут факт скажэньня ленінскага вучэньня аб друку, аб ролі чырвонай і чорнай дошак.

Некаторыя нашы газэты яшчэ не навучыліся захоўваць сьвятло і цень, даваць матар'ял, як «заштурхоўваючы», так і «прыцягваючы».

На пытаньне ў рэдактара лагойскай райгазэты ў часе весенняй пасэўнай кампаніі: «Чаму ў цябе ўсё аб дрэнным, нічэго-ж няма ў рабоце аднаго калгасу, брыгады, якія маюць посьпехі?» — ён адказвае: «Затое, ў мяне ў наступным нумары будзе выключна аб добрым».

Зразумела, такі падыход можа толькі дэзарганізаваць нашу работу. Хіба-ж у Лагойску ўсё было толькі дрэннае, і раптам усё стала добра? Ніякова не. Справа ў тым, што рэдакцыя ня здолела даць правільны аналіз становішча раёну. Трэба ўмець пільнаваць ацэнку становішча. Гэтага можна дасягнуць толькі тады, калі газэта ня будзе жыць на самацёку. Прыбываюць селькоры, якія пішуць аб добрым, прыбываюць аб дрэнным, тады... чакаюць, пакуль жывыя прыклады новага трапяць самі ў рэдакцыю. Ня весьці адпаведнай арганізацыйна-масавай работы — значыць не разумець сутнасьці бальшавіцкага друку.

Асьвейская газэта (пры старым кіраўніцтве), задумала даць прыкладны плян размеркаваньня ўраджаю. Сама ідэя, зразумела, вельмі капітальная і неабходная. Але што-ж газэта для гэтага зрабіла? Першую пашпўную заметку аб размеркаваньні ўраджаю яна дала як прыклад для ўсіх калгасаў. А ў выніку выявілася, што гэты калгас зусім не зьяўляецца перадавым, тыповым для раёну. Зразумела, што такім показам можна толькі навадзіць. Гэты ўрок павінны ўлічыць пры показе герояў пяцігодкі. Трэба спусьціцца ў завод, у калгас, у брыгаду, вывучыць работу перадавікоў, выяўляць сапраўдных герояў, арганізоўваць на гэту справу шырокія масы рабселькораў, піснды друк. На старонках нашага друку павінны быць показаны сапраўдныя героі, якія заслугоўваюць гаворавай назвы «героя пяцігодкі», у якіх ёсьць у сапраўднасьці чаму павучыцца, па якіх трэба раўняцца.

Трэба выкрываць такога роду думкі, «што гэта за геройства, калі выконвае і перавыконвае плян, ня мае прагулаў».

Мы тут закранулі задачы газэт, але ў нашым арсэнале шырокія, неабмежаваныя магчымасьці папулярызаваць герояў. Літаратура, кіно, тэатры, фота, плякаты, масавыя сходы — усё павінна быць скарыстана для показу сваіх герояў. Такія пачынаньні ўжо ёсьць. Фота-вітрыны ўдарнікаў у пасобных клюбах-кіно зачэпілі прыцягваюць уссагульную ўвагу мас. Мастацкія самадзейныя гурткі на заводах, фабрыках павінны показаць сваіх ударнікаў. Пісьменныя павінны першыя адгукнуцца на заклік віцебскіх кансамольцаў.

Наша краіна напярэдадні пятнаццатай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. За гэты 15 год упісана ня мала бліскучых старонак адвагі і геройства пралетарыяту і працоўнага сялянства Савецкага саюзу.

Багаты ні адно пятнаццацігодзьдзе ў гісторыі не багата такімі паказамі, геройскімі ўчынкамі, як наша сацыялістычнае пятнаццацігодзьдзе. На арэну выступіла кляса, якая прыняла ажыцьцяўляць тое, аб чым марыла і за што змагаліся лепшыя розумы чалавецтва — за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Першая пяцігодка выхавала, загартавала на мала сапраўдных энтузіястаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Показам гэтых герояў, на іх прыкладах будзем выхоўваць ПАДРАСТАЮЧАЕ ПАКАЛЕНЬНЕ.

Я. Ярмашэвіч

Арганізаваць масавы збор жалудоў

Партыя і ўрад далі цьвёрдую дырэктыву па мабілізацыі новых відаў сырцу для нашай бурна ўзрастаючай сацыялістычнай гаспадаркі. Шмат мясцовых арганізацый з гонарам выконваюць гэту дырэктыву. Але ёсьць і такія, якія не патурбаваліся нават пастаяць гэта пытаньне на абмеркаваньне шырокіх мас рабочых, саўгасьнікаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Яны авансам далі адказ: у нас няма новых відаў сырцу. У сапраўднасьці-ж такі адказ нягрунтоўны і апрача шкоды нічога не дае.

Ні для кога не сакрэт, што нашы некаторыя саўгасы, калгасы і аднаасобнікі перажываюць у канцы зімы і ў пачатку вясны нехват кармоў. Ёсьць і такія заводы, якія з-за адсутнасьці сырцу ня выконваюць праграмы па выпуску прадукцыі. Запас кармоў для саўгасаў і калгасаў, запас сырцу для заводаў часта можна папоўніць за кошт вусім новых відаў сырцу.

Ці ёсьць у нас такія віды сырцу? Так, ёсьць. Хто з вас ня бачыў жолуда, гэтага універсала. Усе бачылі, але мусіць ня ўсе добра ведаюць, для чаго ён ужываецца. Між іншым, дубовы жолуд зьяўляецца добрым кармовым сродкам, добрым сырцом для тэхнічнай пераапрацоўкі і добрым экспартным прадуктам.

Што жолуд зьяўляецца добрым кармовым сродкам даволі прывесьці параўнаньне яго з бульбай.

На 100 кілёграм прыпадае (у кілёграмах).

Віды сырцу	Вадзы	Сырога пратэіну	Сырога тлушчу	Безазотыстых экстрактматэр.	Крухмальных эквівал.
Бульбы	75	2,1	0,1	21,1	19,7
Жолуд сьвежы	50	3,3	2,4	36,3	40,4
Жолуд паўсухі	35,4	4,3	3,2	47,1	52,4
Жолуд сухі	15	5,7	4,1	61,6	69,0

Як відаць, жолуд па сваім складзе, як кармовы прадукт, стаіць вышэй бульбы. У 100 кгр. сьвежага жолуду ёсьць крухмальных эквівалентаў у 2 разы больш, чым у бульбе, а ў паўсухіх — амаль у 3 разы.

Адносна адкорму сьвіней жалудамі ёсьць больш-менш дакладныя весткі з германскіх вопытаў. Сярэдні сутачны прырост складаў 636 гр. На адзінку прыросту (кгр.) трэба скармініць 10,2 кгр. жалудоў. Якасьць сала і мяса пры адкорме на жалудох здавальняючая.

У БССР ёсьць рад гаспадарак, якія практыкуюць адкормы сьвіней жалудовай мукою ў мешаніне з аўсянай, ячменнай, іржаной.

Жалуды могуць служыць добрым кормам разам з сенам для авец і адкорму валоў. Выпечаныя з жалудовай мукі хлябцы можна даваць курам для павялічэньня іх яйкапоскасьці.

Ці варта ў БССР шырока разгарнуць працу па зборы жалудоў, як кармовага сродку для жывёлы? Тысячу раз варта. Саўгас, калгас пры мінімальнай затраце можа павялічыць свой кармовы баланс і тым самым пацвесьці больш моцную базу пад гадоўлю жывёлы.

Жолуд шмат мае безазоцістых матэрый, або вугляводаў. З вугляводаў можна здабываць сьпірытус. Устаноўлена, што 1 цэнтн. жалудоў мае крухмалу ў 2 разы больш, чым цэнтнэр бульбы. Са 100 кгр. бульбы, крухмалістасьцю ў 18 проц., можна атрымаць 10,8 літраў бязводнага сьпірту, а са 100 кгр жалудоў — 24—25,5 літраў сьпірту, г. зн. адна ватавая адзінка жалудоў дае сьпірту ў 2 разы больш, чым ватавая адзінка бульбы.

Як вядома, нашы сьпіртныя заводы з-за адсутнасьці сырцу ня выконваюць сваіх прамфінпляну. Тут можа паўстаць пытаньне, навошта нам трэба так многа сьпірту?

У СССР ня было свайго каучука. Прыходзілася яго завозіць з каапіталістычных краін. Новым гігантам-аўтазаводам патрэбна шмат каучука. Тав. Сталін сказаў: «У нас ёсьць усё, апрача каўчука. Але праз год-два і каўчук будзем мець у сваім распараджэньні».

Словы вялікага правадыра апраўдаліся. Ужо працуюць два гіганты заводы сынтэтычнага (штучнага) каўчука. Для вырабу штучнага каўчука галоўны сырцом служыць той сьпірт, які выпускаюць нашы заводы. Значыцца з жалудоў можна гнаць сьпірт і адпраўляць яго на заводы сынтэтычнага каўчука.

Далей, сьпірт патрэбен, як гаручае для нашага аўтатрактарнага парку, авіяі і рэчнага транспарту. Сьпірт служыць сырцом больш чым для 150 розных рэчаў.

Трэба пакласьці максымум энэргіі, каб сьпіртныя заводы выконвалі свае праграмы. Зборам жалудоў можна павялічыць сырцовую базу сьпіртнай індустрыі.

Для кава-цыкорнай прамысловасьці жалуды зьяўляюцца адным з галоўных відаў сырцу. Кава з жалудоў мае вялікія харчовыя ўласьцівасьці, а таму мы павінны быць зацікаўлены ў пашырэньні гэтай галіны прамысловасьці, зьбіраць жалуды і здаваць загатоўчым арганізацыям.

Нарэшце, жолуд служыць адным з відаў экспарту. З БССР жолуд экспартуецца за межы. Зборам жалудоў узмацняюцца нашы экспартныя магчымасьці.

Такім парадкам жолуд зможа ўзмацніць нашу кармовую базу, павялічыць сырцовыя рэсурсы прамысловасьці і нашы экспартныя магчымасьці. Вось чаму перад саўгаснікамі, калгаснікамі і аднаасобнікамі стаіць баявая задача — арганізаваць масавы збор жалудоў.

Як-жа многа ў нас жалудоў? У БССР ёсьць дубовых лясоў 124 тыс. га. Сярэдні ўраджай жалудоў з га лічыцца 10 цэнтн. Ва ўраджайныя гады ён можа быць у шмат разоў большы. Калі-б сабраць сярэдні ўраджай жалудоў, то мы мелі-б 1.240 тыс. цэнтн. Па кармовых уласьцівасьцях гэтыя жалуды раўняюцца 2.480 тыс. цэнтн. бульбы. Каб атрымаць такую колькасьць, трэба мець пасеўнай плошчы пад ёю больш як 25 тыс. га. З такой колькасьці жалудоў можна атрымаць больш 6.200 тыс. вёдраў 40° сьпірту.

Прыведзеныя лічбы так шмат гавораць, што мы ня можам на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва іх ігнараваць.

Трэба рабочым саўгасаў, калгаснікам і аднаасобнікам аддаць максымум сілы і ўвагі гэтаму важнаму пытаньню. З бальшавіцкай настойлівасьцю яны павінны арганізаваць масавы збор жалудоў у гэтым годзе.

Здаровым паравозам здаровыя вагоны

Без адпраўленьня вагоннай гаспадаркі немагчыма далейшае паляпшэньне ўсёй работы транспарту і пасьпяховае правядзеньне асеньня-зімовых перавозак.

Хворы вагон цягне ўніз крывую нагрузкі. З хворымі вагонамі ня выканаць пяроктывы партыі і ўраду аб штосутачнай нагрузцы 61 тысячы вагонаў. Вось чаму праблема адпраўленьня таварнага вагоннага парку пастаўлена зараз у цэнтр увагі ўсіх чыгуначных арганізацый.

Па-бальшавіцку арганізаваць рамонт вагонаў, хутка і добраякасна выконваючы гэту работу, — у гэтым аснова ўздыму вагоннага парку.

Адмоўна, на сёньняшні дзень вагона-рамонтныя пункты Аршанскага раёну і завод «Польмя рэвалюцыі» слаба спраўляюцца з гэтымі задачамі.

Процант хворых вагонаў высокі. Пры заданьні 7,2 проц. выкапана ў верасьні 8,04 і за першую пяцідзёнку кастрычніка — 7,42. Бываюць дні, калі колькасьць хворых вагонаў па Менску даходзіць да 59, пры заданьні 20, і па Воршы — да 64, пры заданьні 40.

Завод «Польмя рэвалюцыі» ня выконвае праграмы. Замест 12 вагонаў, выпускае з кампэнцыі 5—7, прычым часта дапускае бракі.

Кепскі рамонт вагонаў па кавэнцыі, падбойныя аглядкі агентаў станцыі да догляду за прыгоднасьцю вагонаў пры патрэбы экспартных грузаў выклікаюць перагляду за прыгоднасьцю грузаў выклікаюць грузку на кантрольным пункце ў Менску, тым асабліва адзначаюцца станцыі Барысаў — Аршанскага раёну, Зах. Дзьвіна — Віцебскага раёну, Неп—Рэчыцкага раёну, Даволі прывесьці адзін прыклад: з 20-ці вагонаў пагрузкі ст. Заходняя Дзьвіна, 18 паступіла для перагрузкі і ў рамонт.

Адмоўна адбіваецца на прадукцыйнасьці гарэньне буксаў хаця і паменшыліся, але далёка не ў выстарчальнай ступені. У жніўні было 235 адчэпак, у верасьні — 131. У гэтай справе судовая рэвізія букс, якая праводзіцца з 1 кастрычніка па 15 лістапада, павінна даць карэннае паляпшэньне.

Працягваючы далейшую барацьбу за перавыкананьне заданьня (за 18 дзён праровізавана 1.047 вагонаў пры заданьні 900), трэба ўсю ўвагу зьвярнуць на якасьць ровізіі.

На абменных пунктах выпуск браку слаба зьмяншаецца. За жнівень у Менску было забракавана 249 вагонаў, у Воршы—1.428, За верасень у Менску забракавана 163, у Воршы — 888.

На пунктах няма гаспадарчых адносін да скарыстаньня ўнутраных рэсурсаў, няма клапатлівасьці аб вырабе частак і інструментаў. Бувалды, сьлясарныя малаткі бяз ручак, а майстра пункту Воршы заходняй Курнавіч ня прымае меры, каб зрабіць неабходны рамонт.

Адмоўна адбіваецца на працуцьнійасьці працы дрэнная пастаноўка грамадзкага харчаваньня і не здавальняючыя бытавыя ўмовы рабочых.

На абменным пункце Воршы-заходняй сталовай няма. Дастаўка абедаў нерэгулярная і ў невыстарчальнай колькасьці. Не ўпарадкавана пытаньне з харчаваньнем вагоньнікаў і на ўсходняй. ТСТ і сэктар грамадзкага харчаваньня недапасьпяваюць першараднай важнасьці забесьпячэньня вагоньнікаў.

Вагоньнікі жыцьлём забясьпечаны толькі на 50 проц. і ніхто не клапоціцца забясьпечыць іх помнасьцю.

У кваліфікаваных кадрах вагоньнікаў адчуваецца вострая патрэбнасьць. Колькасна работай сілай вагоннае дэпо і абмэнны пункт хоць і забясьпечаны, але кваліфікацыя большасьці майстраў сяжая. Для ўзьняцьця кваліфікацыі арганізацыямі дэпо нічога ня робіцца. Не выдаюцца на руки рабочым дагаворы на зьдзельныя работы.

У топар 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі вагоньнікі абавязаліся ліквідаваць адставаньне, дабіцца зьніжэньня процэнту хворых вагонаў ніжэй нормы. Пасьпяховае выкананьне гэтых абавязацельстваў залежыць у значнай ступені ад разгортваньня партыйна-масавай работы, якая яшчэ значна адстае. У вагонным дэпо Ворша-ўсходняя яе зусім не адчуваецца.

У аршанскіх чыгуначніках ёсьць вялікі вопыт работы на асьвоеньні паравознай гаспадаркі. Трэба, каб гэты вопыт перадаць вагоньнікам. Трэба дапамагчы ім правільна арганізаваць працу і расцэнкі, умацаваць партыйна-арганізацыйнае і тэхнічнае кіраўніцтва, узьмаць на належную вышыню партыйна-масавую работу.

Я. Пракаповіч.

Панарама пабудовы скрубяроў Магнітагорскага камбінату

Напярэдадні Кастрычніцкіх сьвят

НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ СУСТРАКАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ 15-ю ГАДАВІНУ КАСТРЫЧНІКА

15 ГОД БАРАЦЬБЫ ЗА ЛЕНІНІЗМ

(Вечар успамінаў кіраўнікоў-бальшавікоў аб Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі

МАСКВА, 24/X. Сёньня ў будынку прадстаўніцтва БССР адбыўся сход, прысьвечаны успамінам кіраўнікоў-бальшавікоў, удзельнікаў Кастрычніка і грамадзянскай вайны на Беларусі. На сходзе прысутнічалі т. т. Кнорын, Калмановіч, Любімаў, Уншліхт, Славінскі, Грузель, Фамін, Каменшчыкаў, Ангарэйціс, Бракоў, Рудзман, Пенкін, Агранаў, Цехановіч, Алібекаў, Крыніцкі-Бажні, Пярно, Рагазінскі, Скуратовіч, Царэнцева, Цахоўскі, Грашчынскі і інш., усяго 70 чал.

Па даручэньні ЦК КП(б)Б і СНК БССР сход адкрыў старшыня СНК БССР тав. Галадзед М. Н.

У прэзыдыум выбраны т. т. Галадзед, Кнорын, Фомін, Калмановіч, Славінскі, Любімаў, Цехменеў, Алібекаў. У ганаровы прэзыдыум выбрана палітбюро ЦК УсеКП(б), бюро ЦК КП(б)Б і бюро КПЗБ.

Тав. Галадзед коратка асьвятліў дасягненьні Савецкай Беларусі за 15 год Кастрычніка. Заканчваючы сваё слова тав. Галадзед сказаў:

— Мы энэргічна і сумленна, як падабае бальшавікам, пад кіраўніцтвам ЦК на чале з тав. Сталіным ажыцьцявілі і працягваем працаваць над тым, што нашай партыяй на чале з Леніным і вамі, як піянэрамі, было закладзена ў гістарычныя дні вялікага Кастрычніка ў Беларусі. Па даручэньні ЦК КП(б)Б і СНК БССР я зварачаюся да вас з просьбай аднавіць шляхам успамінаў, як бальшавіцкая партыя на Беларусі падрыхтоўвала, змагалася і перамагла ў вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю, выконваючы агульную задачу вялікага Кастрычніка расійскай пралетарскай рэвалюцыі.

Гісторыя барацьбы КП(б)Б, ёсьць гісторыя клясавай барацьбы ў БССР. Каб вучыць маладое пакаленьне, каб правільна разумець гісторыю, яе трэба ведаць. Сёньняшні вечар паслужыць пачаткам, калі таварышы—кіраўнікі бальшавіцкай арганізацыі, актыўныя ўдзельнікі Кастрычніка і грамадзянскай вайны ў Беларусі ўспомняць шляхі барацьбы і перамог і напішуць аб гэтым.

З дакладамі выступілі: т. т. Кнорын «Рухаючыя сілы Кастрычніка ў Беларусі». Алібекаў «Партыя ў барацьбе за Кастрычнік у Беларусі». З успамінамі выступалі т. т. Пятроў, Рагазінскі, Дзьмітрыеў і інш.

БУРТЫКО

Самаабавязацельствы ажыцьцяўляюцца з посьпехам

Чырвонасьцяжная швейная фабрыка «Кастрычнік» (Менск) мае шмат перамог у справе бальшавіцкай барацьбы за выкананьне прамфінпляну. Яна выканала плян першай пяцігодкі за 3 гады. Перамагаючы ўсе труднасьці з посьпехам выконваецца плян 4-га заключнага.

Трэці агрэгат на працягу месяца асвоіў новы асартымэнт прадукцыі і даў самыя лепшыя паказальнікі выкананьня прамфінпляну. Камсамольская істужка з месяца ў месяц таксама выконвае і перавыконвае свой прамфінплян. За трэці квартал яна ажыцьцявіла сваю вытворчую праграму на 100,1 проц. Цэх шырспажыву, які арганізован толькі ў ліпені бягучага году, выканаў прамфінплян 3-га кварталу на 102 проц., выпусьціўшы прадукцыі на 130 тыс. руб., а ў 4-м квартале мяркуецца выпусьціць на 190 тыс. руб.

У парадку падрыхтоўкі да XV гадавіны Кастрычніка, рабочы калектыў фабрыкі прыняў на сябе рад самаабавязацельстваў у павышэньні прадукцыйнасьці працы і паляпшэньні якасьці прадукцыі. Абавязацельствы давядзены да кожнага цэху і брыгады, якія ў сваю чаргу высунулі сустрэчныя самаабавязацельствы. Для штодзённай праверкі ходу ажыцьцяўленьня самаабавязацельстваў і апэрацыйнага кіраўніцтва ўсёй работай па падрыхтоўцы да святкаваньня XV гадавіны Кастрычніка, у цэхах створаны спэцыяльныя камісіі і агульна-фабрычны штаб.

ЗРК фабрыкі абавязаўся падрыхтаваць выдачу рабочым сьвяточнага пайка па пьвёрдых цэнах на суму 25 руб. і закончыць выдачу бульбы—па 125 кілё на кожнага рабочага і па 45 на ўтрымальца.

Арганізаваны пры фабрыцы ўвосьлу гэтага году калгас датэрмінова скончыў уборку гароцінны і бульбы, даўшы рабочым 46 тон гуркоў, 213 тон бульбы, 150 тон капусты.

Скончана пабудова двух стандартных дамоў для рабочых. У хуткім часе будуць скончаны яшчэ два дамы і пабудавана новая сталовая.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы ўмеламу апэрацыйнаму кіраўніцтву з боку прыкутніка фабрыкі і энтузіязму рабочых.

Хейман.

Гаспадарча-разрахунковыя брыгады імя XV Кастрычніка

Працоўныя Гомеля па-баявому рыхтуюцца да 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Уся падрыхтоўка праходзіць пад лёзунгам пасьпяховага завяршэньня пляну апошняга году пяцігодкі, фарсаваньня тэмпаў па выпуску прадметаў шырокага ўжытку, разгортваньня савецкага і калгаснага гандлю.

З вялікім уздымам праходзіць падрыхтоўка на прадпрыемствах.

На заводах імя Ланцуцкага, «Пралетары» і Сельмаш, на фабрыцы «Праца», Палесдрэў і радзе іншых прадпрыемстваў разгарнулася масава-растлумачальная работа. На заводзе імя Ланцуцкага ў топар XV Кастрычніка арганізоўваюцца новыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады. Завод абавязаўся даць падшэфнаму Ўнецкаму чыгуначнаму раёну 300 падшыпнікаў нармальнага тыпу да таварных вагонаў, 50 штук бунзэрных стаканаў, 100 ніжніх і 50 верхніх букс, 100 штук рэсор. Па заводзе абвешчан збор прапаноў у фонд XV гадавіны Кастрычніка. Намечана сабраць ня менш 150 прапаноў. Апрача таго, завод абавязаўся павялічыць выпуск тавараў шырспажыву звыш пляну на 1.000 руб. У мэтах паляпшэньня рабочага снабжэньня, павялічваецца стада прыгарадкай гаспадаркі на 70 шт. сьвіней і трусаматак. Перадавыя цэхі заводу ўзялі на буксір адстаючы — калёны.

Завод «Пралетары» ўсю падрыхтоўку да Кастрычніцкіх сьвят праводзіць пад лёзунгам выкананьня прамфінпляну 4 кварталу за 7 лістапада на менш як на 50 проц. Шырока разгарнулася ўнутры-заводская вытворчая нарадчыка і спаборніцтва паміж цэхамі і брыгадамі. Рабочы калектыў абавязаўся дапасьпяваць асвоіць выпуск помпаў «Варайтон». Брыгада па зборцы гэтых помп высунула сустрэчны — да кастрычніцкіх сьвят выпусьціць замест 70 — 88 помп.

Рабочыя абутковай фабрыкі «Праца» абавязаліся да 15-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ліквідаваць адставаньне ў выкананьні прамфінпляну, арганізаваць дзьве новыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады імя XV Кастрычніка. Гаспадарча-разрахунковая брыгада заязорыйчыкаў высунула сустрэчны — на 15 проц. звыш пляновага заданьня.

Пры гарконе партыі арганізавана камісія па падрыхтоўцы да сьвяткаваньня XV Кастрычніка. Ужо намечан плян і рад мерапрыемстваў па правядзеньні кастрычніцкіх сьвят. Спэцыяльна да кастрычніцкіх дзён прызначана адкрыцьцё культурных устаноў і заселеньне новых дамоў рабочымі.

Н. ГАСМАН.

Інж. Розін

Скарыстаць багацьці зямлі на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва

Бурны рост прамысловасьці БССР забясьпечыў рашучыя зрухі ў эканоміцы нашай краіны. У бліжэйшай пяцігодцы БССР, краіны з адсталай сельскай гаспадаркай, павінна стаць краінай індустрыяльна-аграрнай з ужываньнем навейшых дасягненьняў сучаснай навукі і тэхнікі.

Рост народнай гаспадаркі ў другой пяцігодцы патрабуе большай увагі да хаміі, як аднаго з асноўных стрыжняў сацыялістычнага перабудаваньня краіны. Хэмізацыя краіны прад'яўляе ўсё новыя і новыя запатрабаваньні да крыніц мінэральнага сырцу. Сучасная здабыча сырцу не задавальняе патрэб хэмічнай прамысловасьці БССР. Трэба значна пашырыць запасы мінэральнага сырцу, уключыць у эксплёатацыю новыя крыніцы, адшукаць і дастасаваць новыя віды яго, новыя мэтады распрацоўкі і перапрацоўкі на аснове ўкараненьня новых тэхналёгічных працэсаў геолёга-дасьледчых работ.

Усё гэта ставіць перад геолёга-дасьледчай навуковай думкай у галіне выяўленьня і вывучэньня запасаў мінэральнага сырцу рад актуальных праблем у другой пяцігодцы.

На геолёга-дасьледчыя органы і на навукова-дасьледчыя ўстановы, якія вядуць работы па тэхналёгічным вывучэньні мінэральнага сырцу, усклаецца задача ісьці са сваімі работамі наперадзе прамысловасьці. Гэта ня толькі ўскладае вялікую адказнасьць, але і дае яшчэ правы. Апошнія заключаюцца ў тым, каб ня толькі накапляць апісальны, эксперыментальны і аналітычны матар'ял, але і ствараць абагульняючыя гіпатэзы, ставіць пошукі, далёка ідучы за рамкі фактаў, прагноз «з усёй злучанасьці даных і назіраньняў калектыўнай думкі, будуючы будучыню ў формах, якія пакуль што нельга даказаць, і можна толькі прадбачыць» (словы акадэміка Фэрсмана).

Гэта права сьмелага ўзьлёту, зьвязанае з правам рызыкі, права і нават абавязак заглядваньня далёка ўперад—ніхто ў сьвеце не прадастаўлена людзям, якія працуюць навукова ў галіне геолёгіі ў такой меры, як гэта мае месца ў нас у СССР. Ідэя прадбачаньня на базе строга навуковага аналізу і сінтэзу павінна знайсьці сваё адлюстраваньне ў плане геолёга-дасьледчых і навукова-дасьледчых работ на другую пяцігодку. Гэта неабходна, як у адносінах усяго агульнага геолёгічнага асьвятленьня краіны, так і пытаньняў мінэральнай і сырцовай базы, якая забясьпечвае патрэбнасьці хэмізацыі краіны. У галіне хэміі БССР адстала больш чым ва ўсіх астатніх, і таму шырокі і нэральнай сырцовай базай для яе, павінны заняць асабліва важнае месца ў рабоце геолёга і навукова-дасьледчых установаў у другой пяцігодцы.

Інжынэр РОЗІН

Перш за ўсё, павінны быць зжыты старыя мэтады геолёгіі, адарваныя ад патрэб жыцьця, ад патрэб народнай гаспадаркі, ад дасягненьняў сучаснай навукі.

У плян геолёга і навукова-дасьледчай работы ў галіне мінэральнага сырцу павінны знайсьці месца новыя шляхі і новыя ідэі, ідэі геа-хэміі, тэхналёгіі і эканомікі, новыя мэтады геафізыкі і ўзбагачэньня.

Перш за ўсё, нам трэба ўзяць канкрэтны ўпор на разьведку пэўных карысных выкапняў.

Мы ведаем, што за апошнія 3-5 год шырока пастаўленыя дасьледчыя работы ў СССР у многіх адносінах карэнным чынам перабудавалі наша ўяўленьне аб цэлым радзе галін, якія да таго часу лічыліся ня цікавымі ў геолёгічных адносінах. Геаграфічная карта цэлага раду важнейшых карысных выкапняў аказалася зусім неакрэсленай. (Хібіны, Кольскі паўвостраў, Казакстан, Башкірыя). Пад пакровам тундраў і стэпаў, дзякуючы навейшым мэтадам разьведкі і навукова-дасьледу, былі выяўлены месцанараджэньні важнейшых выкапняў.

Беларусь лічылася краінай, у якой горнапрамысловы кірунак не накладае вылучнага адпячатку, як на горнапрамысловы поўдзень Саюзу—Данбас, Урал, частка Каўказу, Кузбас і інш.

Адмоўна, праведзеная геолёга-дасьледчымі органамі рэспублікі (Белгеоразьведка, геолёга-дасьледчы інстытут БАН) у 1927 г. работа паказвае, што ў значнай меры ранейшая думка аб беднасьці карысными выкапнямі БССР, аб нецікавасьці не геолёгічнай пабудовы павінна быць выкінута за борт. Па значнай плошчы БССР праведзены геолёгічныя здымкі і геолёга-дасьледчыя работы; выяўлен і вывучан рад месцанараджэньняў неабходнага для народнай гаспадаркі сырцу. У прыватнасьці для забясьпячэньня сырцовай базы для хэмізацыі краіны выяўлены і вывучаны месцанараджэньні фасфарытаў у вярхоўях Сожу (сожаўскае фасфарытнае месцанараджэньне) каля Мсьціслаўля з запасамі па грунце АБС каля 21 млн. тон канцэнтрату на плошчы прамысловага залежу каля 2.400 га.

Таксама знайдзены залежы ваваміТаў і даламітызаваных вапнякоў недалёка ад ст. Дараганава, каля Суздалёўкі (сожаўскае фасфарытнае месцанараджэньне), Вярхоўе-Лезая Руба (каля Віцебску). Запасы гэтых месцанараджэньняў дазваляюць разгарнуць шырокае выпрацоўку тэрмазаляцыйных матар'ялаў (вата, літ) і магнэзіяльных соляй.

Залежы высока якасных крэйдаў у раёне Крычава, Іванаўскага, Дзяржынскага і ў цэлым радзе іншых месц БССР дазваляюць шырока разгарнуць прамысловасьць плаўлекай і малатай крэйды.

Ёсьць залежы пяскоў і крэйды для мэханізаванай гуты ў Гомелі, высокаякасныя пяскі для лешных відаў шкла (Салаўёў хутар, недалёка ад Ляхавай гары па р. Дняпры) для гуты «Домбаль» і інш.

Выяўлена магчымасьць выкарыстаньня для плаўкі, замены дэфіцытных матар'ялаў (шкла, буданічных матар'ялаў, мэталяў) лёгкаплаўных глін і дасьледван цэлы рад месцанараджэньняў іх, (Шалапына каля 1-ай БелДРЭС), што як паказалі работы, праведзеныя інстытутам прамысловасьці БССР, дазваляе разгарнуць зараз шырокую выпрацоўку пёмных гатункаў шкла для кансэрвовай тары, буданічнага шкла, крышталізацыйных мас, а таксама замяніцеляў мэталяў.

Выяўлены і частково дасьледаваны ў паўночнай частцы БССР у раёнах Асьвейскім, Сіроцінскім, Лепельскім, Сураскім і інш. месцанараджэньня сапрапэляў вазёрных і балотных, паўвыкапняў на плошчы каля 100 тыс. га; гэтыя запасы могуць адыграць вялікую ролю для народнай гаспадаркі нашай краіны і, перш за ўсё, для яе хэмізацыі, як крыніца мінэрально-масьлянай і хэмічнай прамысловасьці.

Дасьледаваны пясчаныя для агламерацыі-дынасу, а таксама пашырэньня разьведаны пірафіліты і каліны для кісьлотагрэлых і агнятрывалых вырабаў у раёне Сўрукі і глины для тых-жа мэт у раёне Чавусінім, Ляхавай гары.

Дасьледаваны месцанараджэньні фарбовачных руд, глін і зямель у раёне Лоева і ў іншых месцах, чым падведзена база пад разьвіцьцё фарбовачнай прамысловасьці.

Адмоўна, як на значны результат праробленай работы, разьбіўшы міф нашых ворагаў аб тым, што Беларусь у геолёгічных адносінах—пусты месца, што яна ня можа будаваць сваёй прамысловасьці па мясцовым мінэральным сырцу,—яны, (результаты) усё-ж далёка невыстарчальна для таго, каб мець яснае ўяўленьне аб геолёгічным будаваньні БССР, каб забясьпечыць будучыя патрэбы хэмічнай прамысловасьці, патрэбы індустрыялізацыі і хэмізацыі ўсіх галін народнай гаспадаркі, каб мець магчымасьць вызначыць шырокі шлях усямернага разгортваньня прадукцыйных сіл БССР.

Чым жа павінны кіравацца геолёга-разьведачныя і навукова-дасьледчыя органы, якія працуюць у галіне мінэральнага сырцу для хэмічнай прамысловасьці для таго, каб ня толькі поўнасьцю задаволіць патрэбы другой пяцігодкі, але і заглянуць далёка ўперад?

Асноўным момантам, якім трэба кіравацца пры выбары напрамку геолёга-разьведачнай і дасьледчай работы ў будучым,—павінны быць, апрача звычайных вывадаў геалёгічных дыскусыяў, законы гэахэміі, якія паказваюць на магчымасьць разьмеркаваньня і перамяшчэньня хэмічных элемэнтаў зямлі ў рамках торыторыі БССР. Гэта дасьць магчымасьць прадбачыць знаходжэньне тэй ці іншай матэрыі па гэтай тэрыторыі; высьветліць пытаньні замены дэфіцытных элемэнтаў іншымі і ўзбагачэньня бедных выкапняў, высьветліць законы міграцыі элемэнтаў і геахэмічных раёнаў, прынцыпы комплекснага выкарыстаньня парод і адкладаў, утылізацыі адходаў. Гэта дасьць магчымасьць у другой пяцігодцы будаваць новую асмысленную прамысловасьць на новай навуковай базе.

Грунтуючыся па гэтым, нам у БССР трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на дасьледаваньне і здабычу нярудных выкапняў (фасфарыт, даламіт, крэйда, вапна, гліны, каўчадан) якія заключаюць самыя распаўсюджаныя хэмічныя элемэнты часткі літасферы БССР, зьвярнуць увагу на галіны горнай справы, якія ў нас па Саюзу і БССР адсталі ад іншых і не занялі таго месца, якое яны павінны займаць у народнай гаспадарцы.

Пабудова пляну геолёга-разьведачных і навукова-дасьледчых работ на прынцыпах геахэміі ставіць БССР перад неабходнасьцю ўлічваць факт канцэнтрацыі ў нас вугляводу ў каўстабіалітах галоўным чынам на паверхні: сапрапэлях і торфах; выкарыстаньне гэтага факту пры пабудове пляну хэмічнай прамысловасьці павінна легчы ў аснову яго.

Ня гледзячы на тое, што Беларусь—краіна нарудных выкапняў, торфу і сапрапэляў, перад геолёга-разьведачнымі органамі павінны быць пастаўлены і заданьні адшуканьня мэталяў, соляй і вугалю.

Гэта патрабаваньне нашай краіны павінна быць у якасьці сацыялістычнага заказу прынята геолёга-разьведачнымі і навукова-дасьледчымі органамі.

У заключэньне неабходна пацьвердзіць, што калізарныя патрабаваньні, якія прад'яўляюцца ў другой пяцігодцы ў адносінах розначага віду мінэральнага сырцу і перш за ўсё да мінэральнага сырцу з боку хэмічнай прамысловасьці, ставіць перад геолёга-разьведачнымі органамі і навукова-дасьледчымі ўстановамі патрабаваньне максымальнага паскарэньня тэмпаў вывучэньня геалёгіі і мінэральнага сырцу БССР.

Перад народнай гаспадаркай БССР і перад хэмічнай прамысловасьцю стаяць вялізарныя праблемы па тэхналёгічным і гаспадарчым асваеньні гэтых сырцовых рэсурсаў.

Гэта патрабуе асаблівага размаху геолёга-разьведачнай і дасьледчай работы. Без размаху нельга праскочыць у тэмпы пяцігодкі, бяз сьмеласьці няма адкрыцьця.

«Для таго, каб вырашыць гэтыя задачы, каб ажыцьцявіць выкарыстаньне прыродных рэсурсаў, якія прыпадаюць на кожную з асобных галін, неабходна разгарнуць вы ключную работу па разьведках і пошуках тых ці іншых выкапняў, асабліва ў мала асвоеных у прамысловых адносінах раёнах. Таму пры распрацоўцы пляну другой пяцігодкі неабходна запраектаваць такое разгортваньне геолёга-разьведачных работ і стварыць такую матар'яльна-тэхнічную базу для іх, якія забясьпечылі-б поўнасьцю вырашэньне гэтых задач і падрыхтавалі-б нашы выключныя прыродныя рэсурсы для ўсямернага прамысловага выкарыстаньня іх і разгортваньня вытворчасьці» (з даклада тав. Куйбышава аб 2-й пяцігодцы на XVII партканфэрэнцыі).

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦК КП ФРАНЦЫІ ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ ЎсеКП(б)

ПАРЫЖ, (ТАСС). «Юманітэ» апублікавала наступную рэзалюцыю, прынятую Цэнтральным Камітэтам кампартыі Францыі.

«Сабраўшыся для абмеркаваньня пастаноў XII пленуму ВКП і прыняцьця пастаноў, неабходных для іх правядзеньня ў жыцьцё, Цэнтральны Камітэт ВКП пасылае сваё брацкае прывітаньне Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б), які кіруецца тав. Сталіным.

У момант, калі рабочая кляса ўсяго сьвету рыхтуецца да сьвяткаваньня XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, Цэнтральны Камітэт кампартыі Францыі лічыць неабходным падкрэсьліць сваю поўную салідарнасьць і сваю поўную згоду з палітыкай УсеКП(б), якая дала магчымасьць ажыцьцявіць пяцігодку за чатыры гады, пабудаваць фундамант сацыялістычнай эканомікі і прыступіць да распрацоўкі другога пяцігадовага пляну, які мае сваёй мэтай пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Цэнтральны Камітэт кампартыі Францыі цалкам ухваляе ўсе меры, прынятыя бальшавіцкім ЦК УсеКП(б) супроць контр-рэвалюцыйнай групы Руціна і яго саўдзельнікаў — Зіноўева і Каменева.

Напярэдадні XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі Савецкі саюз неабвержна даказаў перавагу сацыялістычнага грамадзтва над капіталістычным ражымам, які ўсё больш расхіствацца пад ударамі крызісу і пад напорам рэвалюцыйных мас, Цэнтральны Камітэт кампартыі Францыі заклікае рабочых і сялян Францыі быць на варце завалтаньняў пралетарскай рэвалюцыі, пільна ахоўваць бацькаўшчыну працоўных супроць пагроз імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі.

Усьведамляючы адказнасьць, якая кладзецца на кампартыю Францыі ў барацьбе супроць імпэрыялістычнай вайны і па абароне СССР, Цэнтральны Камітэт КПФ абавязваецца прыклясьці ўсе сілы партыі да таго, каб выканаць па-бальшавіцку пастановы пленуму Камінтэрну».

КРЫЗІС ПАТРАСАЕ ПАЗШ

Банкруцтвы амэрыканскіх гарадоў

НЬЮ-ЁРК, 22. (ТАСС). Курсы акцый на нью-ёркскай біржы рэзка панізіліся.

Гуртовыя цэны на тавары падаюць далей. Рэзка зьнізіліся цэны па сталь і медзь. Курс даляра зьмяншаецца, ня гледзячы на павялічэньне залатога запасу.

Статыстычная арганізацыя «Дэн энд компані» паведамляе, што ў трэцім квартале вытворчасьць і продажныя зьдзелкі скарацілі́ся на 26 проц., параўнальна з мінулым годам. Лік збанкрутаваўшых прадпрыемстваў павялічыўся на 39 проц. параўнальна з 1931 годам.

Банкіры аказваюць націск на палітычных дзеячоў Нью-Ёрку, патрабуючы памяншэньня бюджэту за кошт зьнижэньня зарплаты камунальным служачым і вымяншэньня дапамог беспрацоўным. У прыватнасьці, банкіры высоўваюць патрабаваньне павялічыць праязную плату на падземных дарогах.

Гарадзкія фонды Нью-Ёрку поўнасьцю вычарпаны. Муніцыпалітэт патрабуе неадкладнага прадастаўленьня грашовых сродкаў для выплаты пэнсіі настаўнікам і інш. служачым. Буйнейшыя гарады Злучаных Штатаў, як Чыкаго, Філядэльфія і Дэтройт стаяць перад тварам сур'ёзнейшага фінансавага краху. У Чыкаго падатковыя паступленьні катастрафічна зьнізіліся. Пэнсія настаўнікам і многім іншым служачым муніцыпалітэту ня выплачваецца ўжо на працягу доўгага часу. Некалькі маленькіх гарадоў каля Нью-Ёрку збанкрутавалі. Органа фінансавых колаў «Уол Стрыт джорналь» паведамляе, што паступленьне падаткаў у Кардэйне (цэнтр алавяна-цынкавай і горнай прамысловасьці ў штаце Оклагому) зусім спынілася. Насельніцтва пакідае горад, які ў хуткім часе будзе зусім пустым.

Дэфіцыт ПАЗШ перавышае ў цяперашні час 500 млн. даляраў. У гэту лічбу ня ўключаюцца авансы, прадастаўленыя рэканструктыўнай фінансавай карпарацыі. Агульная сума дэфіцыту складае звыш 700 млн. даляраў.

Буйнейшае аўтамабільнае прадпрыемства «Джэнэрэль Моторс Корпорэйшэн» мела ў трэцім квартале 1932 году страту ў 4,5 млн. даляраў супроць 3 млн. даляраў прыбытку ў другім квартале.

СЭНАТАР БОРА ЗА ПРЫЗНАНЬНЕ СССР

БЭРЛІН, 24. (ТАСС). «Кельнішэ цэйтунг» зьмяшчае вялікі артыкул амэрыканскага сэнатара Бора, прысьвечаны пытаньням канфэрэнцыі па раззбраеньні. Бора ў катэгарычнай форме выказваецца за германскае патрабаваньне раўнапраўя ва ўзбраеньнях.

«Я хацеў-бы выказаць надзею на тое, — дадае Бора, — што Германія, ня лічачыся са сваімі правамі і патрабаваньнямі, будзе супрацоўнічаць у вырашэньні пытаньняў, што стаяць перад канфэрэнцыяй па раззбраеньні ў Жэневе. Я веру, што такім шляхам яна лепш за ўсё дасягне ажыцьцяўленьня сваіх мэт і намераў у пытаньні аб роўнапраўі».

Пераходзячы далей да пытаньня аб заснаваньні кампаніі ПАЗШ, Бора спыняецца на ўзаемадносінах ПАЗШ і СССР:

«Мы патрабуем пактаў аб міры, — піша ён, — мы выступаем за раззбраеньне, мы хочам міжнароднага міру, і ў той-жа час мы выключаем з нашых грандыёзных плянаў стварэньня лепшага сьвету адну шостую частку зямнае кулі і 160 млн. чалавек, якіх адхілем з нашага кола».

Бора далей заўважае, што ні пытаньне аб дэбітах, ні «свалачасьлівасьць» савецкай сыстэмы ня могуць служыць перашкодай да аднаўленьня нармальных адносін з СССР.

«Нам проста не хапае вытрымкі, разуменьня і волі да супрацоўніцтва па аснове санкцыі мірных шляхоў, — гаворыць Бора. — Асновай усіх плянаў раззбраеньня і ўстанаўленьня міру зьяўляюцца натуральныя, нармальныя эканамічныя і дыпляматычныя адносіны, — іншымі словамі: гатоўнасьць аднаго весьці перагаворы з другім на аснове роўнасьці, роўнапраўя і паважаньня. У працягу 14 год у Савецкім саюзе існуе бязьзьменны ўрад. І ПАЗШ і СССР падпісалі пакт Келёга. Прадстаўнікі амэрыканскага ўраду і прадстаўнікі савецкага ўраду сустракаюцца ў Лёндане і ў працягу многіх дзён дыскутавалі па пытаньні аб гандлі пушнінаю. Мы не зацікаўлены дзейнічаць так, як гэтага патрабуюць інтарэсы прыязных адносін міру і раззбраеньня... Па маёй думцы, ужо дасягнут той момант у пагражаючым ходзе падзей, калі мы павінны імкнуцца да маральнага раззбраеньня. Мільёны галадаюць, ваенныя выдаткі ўзрастаюць, расьце роспач народаў, а цяжар, які на іх укладаецца, становіцца ўсё больш цяжкім. Прыйшоў час ператварыць у дзейнасьць нашы добрыя жаданьні».

БАІ БЕСПРАЦОЎНЫХ З ПАЛІЦЫЯЙ

ВАРШАВА, 23. (Уласн. інфарм.). Сацыялфашысцкі «Роботнік» паведамляе аб крывавых сутычках паміж паліцыяй і беспрацоўнымі ў раёне Катовіц. Сотні галодных беспрацоўных нападаюць на палі панскіх і памешчыцкіх майткаў з мэтай здабыць сабе бульбу. У раёне м. Бяльшовіц паміж беспрацоўнымі і паліцыяй адбываюцца сапраўдныя баі. Гэтымі днямі адбылася сутычка 800 беспрацоўных з паліцыяй. Толькі пасьля прыбыцьця вялікіх паліцэйскіх падразделаньняў з м. Мікалова, паліцыі ўдалося разагнаць беспрацоўных.

СТАЧКІ ПЕКАРОЎ У ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 24. (Уласн. інфарм.). Усяго толькі некалькі дзён назад Варшаўскі маґістрат правёў пры актыўнай дапамозе праф саюзнай бюракратыі і сацыял-фашыстаў паталоўнае зьніжэньне зарплаты на газавых заводах. Аб'яднаныя сіламі паліцыі, сацыял-фашыстаў і рэфарміста́ў гераічная забастоўка рабочых на варшаўскіх газавых заводах была сарвана. З мэтай папярэджаньня стачак выдан спэцыяльны закон, які прадугледжвае пакараньне катаргай за ўсякую спробу арганізаваць забастоўкі на так званых «прадпрыемствах грамадзкага значэньня».

Ня гледзячы на паліцэйскі тэрор, камунальныя рабочыя Варшавы арганізуюць актыўнае контр-наступленьне ў адказ на драконаўскае скарачэньне іх зарплаты. Учора ў Варшаве забаставалі ўсе рабочыя-пекары. Бастуе звыш 3.000 чалавек. Усе сталічныя пякарні заняты паліцыяй. Маґістрат прымае меры да арганізацыі штрэйкбрэхэрства. Польская буржуазная преса б'е трывогу, што забастоўка варшаўскіх пекараў носіць яўна палітычны характар і што бастуючымі кіруюць камуністы.

ПЕРАД ГЕРМАНСКІМІ ВЫБАРАМІ

КАНДЫДАТЫ КАМПАРТЫІ

БЭРЛІН, 24 (ТАСС). Агульнагерманскі кандыдацкі сьпіс кампартыі на выбарах у рэйхстаг узначальваюць т. т. Тэльман, Пік, Шэр, Ульбрых, Флорын, Рэмеле, Гекерт, Далем і Шультэ.

Кандыдацкі сьпіс кампартыі, выстаўлены ў трох буйнейшых выбарчых раёнах Бэрліну, таксама ўзначальваецца Тэльманам. Апрача Тэльмана, кампартыя выстаўляе ў рэйхстаг ад Бэрліну надаўна звольненага старшыню заводзкага камітэту берлінскага транспартнага таварыства Кайзэра, машыніста Гейнэ, рабочага Ольбрыша, работніцу Кірш і інш.

Пераважная большасьць камуністычных кандыдатаў — рабочыя.

З многіх месц паступаюць паведамленьні аб пераходзе ў сувязі з прадвыбарчай кампаніяй, якая разгортваецца кампартыяй, многіх с.-д. і нацыянал-сацыялісцкіх рабочых у кампартыю.

Адбыўся рад шматлюдных прадвыбарчых сходаў, скліканых кампартыяй.

У Бэрліне на прадвыбарчым сходзе з удзелам звыш 5 тыс. рабочых выступіў Вільгельм Пік, у Хэмніцы па двух перапоўненых мітынгах выступіў Герман Рэмеле. У Мантэйме на сходзе з удзелам 6 тыс. рабочых с.-д. старшыня заводзкага камітэту буйнага прадпрыемства «Хучынсон» і кіраўнік нацыянал-сацыялісцкай ячэйкі заводу «Папірус» заявілі аб сваім далучэньні да антыфашысцкага фронту.

Прадвыбарчы сход, скліканы кампартыяй ў Гагене і Гладбаху, дзе ў цяперашні момант бастуюць тэкстыльныя рабочыя, забаронен паліцыяй. На гэтым сходзе павінен быў выступіць кіраўнік германскай рэвалюцыйнай прафарганізацыі Шультэ.

Учора ў Бэрліне пасьля выступленьня на прадвыбарчым сходзе быў арыштован рэдактар «Ротэ фанэ» Гейман.

ПЛЯНЫ АКУПАЦЫІ ДАНЦЫГУ

БЭРЛІН, 23 (ТАСС). «Нэйе вэрнэр нахрытэн», якая выходзіць у Швэйцарыі, апублікавала артыкул варшаўскага карэспандэнта аб польскіх плянах у данцыгскім пытаньні. Паводле паведамленьня карэспандэнта «польскі ўрад пакрыўдзіў патрабаваць увядзеньня ў Данцыг і ў ўсёй данцыгскай тэрыторыі фактычнага манапольнага польскага кантролю. Пры гэтым у Варшаве разьлічваюць на падтрыманьне ў гэтым пытаньні з боку Францыі й на нейтралітэт Англіі».

Пры поўнай ізаляцыі Германіі, — характарызуе карэспандэнт думку польскіх урадавых колаў, — данцыгскае пытаньне павін на быць вырашана сілай зброі. Труднасьці, якія могуць сустрэцца на гэтым шляху, лічацца зусім нікчэмнымі ў сувязі з цяперашнім унутраным і зьнешнім палітычным становішчам Германіі. Карэспандэнт паведамляе далей, што палкоўнік Бэк (таварыш міністра замежных спраў у Польшчы) уручыў Пілсудзкаму мэмарандум, які адностроўвае пункт погляду польскай арміі на гэта пытаньне. У мэмарандуме гаворыцца, што «адзіна правільным адказам на германскае патрабаваньне роўнапраўя можа быць акупацыя рэйнскай вобласьці Францыі і Данцыгу Польшчай». Мэмарандум заканчваецца наступнымі словамі: «Сёньня Польшча яшчэ ў стане кінуць на пасьпяховую барацьбу з Германіяй. Заўтра яна быць можа будзе для гэтага занадта слабай».

«Берлінэр бёрзэн цэйтунг» указвае, што па вестках у польскіх ваенных колах сапраўды існуюць такія пляны і што ў Варшаве згодны паўтарыць гвалтоўны захват Данцыгу па прыкладзе Вільні.

Жандары францускага імпэрыялізму

ВАРШАВА, 24 (ТАСС). Газэта «АБЦ» піша: «У сваёй палітыцы Францыя ня можа апірацца толькі на сваіх саюзьнікаў на кантынэнце, бо яна не праяўляе асаблівага даверу да іх здольнасьці быць магутнай зброяй у адносінах Германіі. Гэта пытаньне павінна асабліва цікавіць Польшчу таму, што па сваёй тэрыторыі і колькасьці насельніцтва яна зьяўляецца галоўным і самым верным саюзьнікам Францыі».

«Па думцы францускіх палітычных колаў,—заключае газэта,—пачай «ахілесавай пятой» зьяўляецца адсутнасьць унутранай палітычнай кансалідацыі, а таксама адсутнасьць належнай арганізацыі гаспадаркі жыцьця краіны».

Другі эндэцкі орган—«Газэта варшавска» лічыць, што роля Польшчы для Францыі падобна да ролі Бэльгіі. Газэта ўказвае, што вера ў папяровыя і юрыдычныя гарантыі перад тварам «імкненьняў Германіі адкавіць сваю даваенную тэрыторыю і сваю даваенную ролю ў Эўропе зьяўляецца ілюзіяй». У заключэньне газэта заяўляе, што «найлепшай гарантыяй эўрапэйскага міру зьяўляецца француская армія і армія яе саюзьнікаў».

„ПЫТАНЬНЕ ЖЫЦЬЦЯ АБО СЬМЕРЦІ“

ШАНХАЙ. (ТАСС). Нанкінская «Джун Гошыбао» указвае, што дзейнасьць партызанскіх атрадаў Манчжурыі выклікае вялікую трывогу ў японскага камандаваньня, якое пачынала патрабаваць падмацаваньняў у разьмерах ад 2 да 4 дывізій, а таксама пабудаваць крэпасьці ў стратэгічных пунктах.

Па словах газэты, японцы ставяць сваёй канчатковай мэтай поўнае зьнішчэньне партызанскага руху яшчэ да таго, часу, калі Ліга нацый пачне абмяркоўваць даклад Літона.

«Упартае супраціўленьне партызан, — піша газэта — перавысіла ўсе японскія чаканьні і калі партызаны ўзмоцняць свае сілы і размах сваіх апэрацый, яны змогуць дабіцца выгнаньня японцаў з Манчжурыі». Газэта ўказвае, што для Японіі пытаньне аб зьнішчэньні партызан зьяўляецца «пытаньнем жыцьця або сьмерці».

ФРАНЦУСКІ ДЭПУТАТ АБ СССР

ПАРЫЖ, (ТАСС). Тулузкая «Дэпэш» працягвае друкаваць карэспандэнцыі выдатнага радыкальнага дэпутата віцэ-старшыні палаты дэпутатаў Дэльбоса, які вярнуўся з СССР.

Наведаўшы «Красный Путиловец» у Ленінградзе, аўтазавод імя Сталіна (б. «АМО») у Маскве, папяровую фабрыку ў Балахне і Растоўскі сельмаш, Дэльбос адзначае, што «гэтыя заводы, забясьпечаныя навейшымі машынамі і ўстаноўкамі, маюць добры выгляд». У карэспандэнцыі, прысьвечанай бакінскай нафтавай прамысловасьці Дэльбос, падкрэсьлівае вялізарны рост насельніцтва Баку, дасягненьні гораду ў галіне добрабыту, а таксама дасягненьні бакінскай прамысловасьці ў галіне ўдасканаленьня тэхнічных прыёмаў здабычы нафты, якія далі СССР марчымасьць павялічыць здабычу нафты, больш чым у два разы параўнальна з даваеннымі часам.

Дэльбос вымушан таксама прызнаць поўную ліквідацыю беспрацоўя ў СССР і вялікую работу па паляпшэньні быту рабочых. У карэспандэнцыі аб курортах Дэльбос падкрэсьлівае, што «савецкая ўлада добра выкарыстала шмы багатых фабрыкантаў і камэрсантаў, арганізаваўшы ў іх мэдыцынскія санаторныя ґ, у прыватнасьці, дзіцячыя ўстановы».

У заключэньне Дэльбос, прыводзячы рад лічбовых даных, указвае, што ў рэзультаце выказанага пяцігадовага пляну, савецкая прамысловасьць зробіла вялізарны скачок наперад, у першую чаргу ў галіне продукцыі чыгуну, сталі, вугалю, сельгасмашын, трактараў, паравозаў і будаўніцтва электрычных станцый.

Японія катэгарычна адхіляе прапанову Гувэра

ТОКІЕ, 25. (ТАСС). Згодна паведамленьня «Сімбун Рэнго» рэда міністраў сёньня пацьвердзіла пастанову морскіх улад катэгарычна адхіліць прапанову Гувэра на канфэрэнцыі па раззбраеньні.

Японскай делегацыі на канфэрэнцыі прапанавала адстойваць прынцып «скарачэньня наступальнай магутнасьці ўзбраеньняў.

Заява Літона

ТОКІЕ, 25. Усе газэты публікуюць паведамленьні, што Літон, выступаючы 22 кастрычніка ў Лёндане, між іншым заявіў: «Пытаньне зараз заключаецца ня ў тым, як прымусіць Японію эвакуавацца з Манчжурыі, а як стварыць умовы, якія дазваляюць Японіі застацца ў Манчжурыі».

Канфэрэнцыя рабочых-ударнікаў Менску

Учора ўвечары, у клюбе імя СТАЛІНА адкрылася канфэрэнцыя ўдарнікаў вытворчасьці гор. Менску.

У склад прэзыдыуму канфэрэнцыі выбраны 42 асобы, сярод якіх тав. ГІКАЛО, ШАРАНГОВІЧ, ЖАБРОЎСКІ, ІВАНОЎ, РЫСЬКІН, ГАЛАДЗЕД, ЧАРВЯКОЎ, ЛЫЧОЎ, ЧАРНУШЭВІЧ, ШПЭКТАРАЎ, КАВАЛЬЧУК, ШУЛЬКІН, ЖОЛУДАЎ, ВАЛОДЗЬКА, БАШМАЧНІКАЎ, КУДРАЎЦАЎ, МІШЧАНКА (рабочы заводу імя Варашылава), МАРЖЭЎСКАЯ (работніца фабрыкі «Кастрычнік»), КОЗІЧ (рабочы заводу «Камунар»), КОРЗІК (рабочы «Полымя рэвалюцыі»), ДРАГІЛЕЎ (рабочы заводу «Бальшавік»), НУРК (рабочы заводу імя Молатава), БРАГІНСКІ (рэдактар газэты «Зьвязда»), ГРЫСЕВІЧ, АБРАЖУНАС, БАЛЦІН, ХЭЙФЭЦ (рэдактар газэты «Рабочий»), ВАЛЫНЕЦ (абменены палітзьняволены Польшчы) і інш.

У склад ганаровага прэзыдыуму выбраны т. т. СТАЛІН, КАГАНОВІЧ, МОЛАТАЎ, КАЛІНІН, ВАРАШЫЛАЎ, АРДЖАНІКІДЗЭ, КУЙБЫШАЎ, КАСІОР, АНДРЭЕЎ, КІРАЎ, ПОСТЫШАЎ, РУДЗУТАК, ТЭЛЬМАН, ЛЕНСКІ, КОРЧЫК, ГІКАЛО і МАКСІМ ГОРКІ.

З дакладам аб XV гадавіне Кастрычніка выступіў сакратар гаркому КП(б)Б тав. ЧАРНУШЭВІЧ. Пасьля дакладу ў спрэчках выступала шмат ударнікаў менскіх прадпрыемстваў, якія адзначалі вялікія посьпехі БССР і Менску ў справе індустрыялізацыі краіны і рапартавалі аб уступленьні ў рады партыі шмат рабочых з вялікім вытворчым стажам.

З вялікай увагай канфэрэнцыя выслухала выступленьне б. беларускага пасла ў польскі сойм, палітзьняволенага, які зараз абменен, тав. ВАЛЫНЦА.

Бурнымі авацыямі сустрэла канфэрэнцыя зьяўленьне на трыбуне першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО, які выступіў з вялікай прамовай.

Канфэрэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і прыняла адозву да ўсіх рабочых, ІТР і служачых прамысловасьці БССР.

Падрабязная справаздача канфэрэнцыі будзе дана ў наступным нумары.

Аб пасылцы рабочых брыгад упадшэфныя сельсаветы па арганізацыі выезду калгасьнікаў і аднаасобнікаў на кірмаш

Пастанова сакратарыяту Менгаркому КП(б)Б ад 25-X-1932 г.

1. Накіраваць па лініі шэфства ў сельсаветы Менскага і прылеглых да яго раёнаў 92 чалавек: завод імя Варашылава — 5, «Бальшавік» — 5, «Камунар» — 5, абутковая — 5, друкарня імя Сталіна — 3, Белдзяржбуд — 3, Эльвох — 2, Вадаканал — 2, завод імя Молатава — 4, Мепбуд — 3, трамвайны парк — 4, Салэстранс — 2, ВЭА — 2, «Камунарка» — 3, хімфарматзавод — 2. Усяго ў Менскі раён — 55 асоб. У Койданаўскі раён: шчотачная фабрыка — 2, «Усход» — 3, утільсыр — 1, шпалерная — 1, друк. «Зьвязды» — 2. Усяго 9 чалавек. У Смалявіцкі раён: чыгуначны вузел (цяга), МК шляху, эксплёатацыя, ДЗ-6, «Полымя рэвалюцыі» (усяго 10 чал.). У Заслаўскі раён: хлебазавод — 2 чал., ф-ка «Беларуска» — 2, бойня — 2, люстэркавая — 2, усяго 7 чалавек. У Лагойскі раён: БЖС — 2 чал. У Піхаўцкі раён: «Кастрычнік» — 3 чал., вушнерная — 2 чал., фабрыка імя Крупскай — 2, «Чырвоны тэкстыльшчык» — 1, лапцавая — 1.

2. Прапанаваць тав. Башмачнікаву і Шулькіну пасьля правядзеньня рабочай канфэрэнцыі вечарам 25 кастрычніка абгаварыць гэта пытаньне на нарадзе сакратароў партколектываў і яч. указаных вышэй прадпрыемстваў.

3. Т. т. Кудраеву, Абрамаву і Фрыцу пераглядзець персанальны склад пасылаемых т. т. і прасачыць за выкананьнем даных пастановы.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.

Рыхтуйцеся да 15-цігодзьдзя Кастрычніка

Усім гаркомам і райкомам ЛКСМБ

27 кастрычніка з 19 гадзін 50 хвілін да 21 гадз. 35 хвілінкі Цэнтральны камітэт камсамолу Беларусі і радыё-газэта «Камсамолец Беларусі» праводзяць усебеларускую камсамольскую радыё-пераклічку па пытаньні падрыхтоўкі да 15 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Польскі археолёг прафэсар Антаневіч аб паездцы па СССР і БССР

У гутарцы з прадстаўніком Белта доктар Антаневіч — праф. археолёгіі Варшаўскага унівэрсытэту, член-карэспандэнт Польскай Акадэміі Навук на рад заданых яму пытаньняў: аб уражаньнях аб міжнароднай археолёга-геалёгічнай канфэрэнцыі, якая адбылася ў Ленінградзе, аб значэньні гэтай канфэрэнцыі для разьвіцьця продукцыйных сіл, аб уражаньнях паездкі на СССР і БССР, зьбліжэньні навук БССР і Польшчы, сказаў наступнае:

Дзякуючы ўмелай арганізацыі канфэрэнцыі, якая знаходзілася пад агульным кіраўніцтвам акадэміка Губкіна, чужаземныя ўдзельнікі вынесьлі добрае ўражаньне ад кантрэсу, які дазволіў ім завязаць асабісты, так патрэбны ў навуковай рабоце кантакт з савецкімі вучонымі, а таксама знаёмства з вялікімі дасягненьнямі савецкай навукі ў галіне нэо-геалёгіі ў СССР.

Гаворачы аб значэньні геалёгічных дасьледваньняў для індустрыялізацыі краіны, праф. Антаневіч адзначыў, што «ў цяперашні момант напружанасьці прамысловых работ у Савецкім Саюзе, ведь геалёгіі чацьвертычнага перыяду маюць выключнае значэньне, таму зразумелым зьяўляецца больш, чым у іншых краінах падтрыманьне геалёгічнага вучэньня ўрадам СССР.

І далей праф. Антаневіч сказаў аб тых сур'ёзных навуковых адкрыцьцях, якія вызначыла ўдзельнікамі кангрэсу з СССР — гэта пазнаньне найважнейшых навуковых пунктаў і цэнтраў Савецкага Саюзу ў яго эўрапэйскай частцы.

— Мы, — гаворыць праф. Антаневіч — навучыліся пазнаваць праблему геалёгіі і праісторыі СССР пад вопытным кіраўніцтвам савецкіх вучоных, за што ім належыць заслужаная падзяка і прызнаньне.

Апрача навуковых спраў, мы бачылі таксама мінаходам вялікія намаганьні СССР у справе індустрыялізацыі саюзных рэспублік. Да найбольш значных аб'ектаў належаць будаўніцтвы Дняпрабуду, Сталінграду і саўгасу «Гігант», а таксама гарадзкое ўпарадкаваньне ў Ленінградзе, Маскве і Менску. Мяне асабліва цікавіла таксама арганізацыя школьнай справы, якая праводзіцца пасьлядоўна, асабліва вышэйшай — унівэрсытэцкай, навуковых інстытутаў, бібліятэк і музэяў. І ў гэтай галіне ўжо шмат зроблена. Для прыкладу надам толькі такое выдатнае будаўніцтва ў БССР, як пабудова ў Менску унівэрсытэцкага гарадка і народнай бібліятэкі. Усюды відаць шмат ініцыятывы, работы і супольных намаганьняў, што ў гэты цяжкі час павінна асабліва захапляць і выклікаць тым больш цікавасьці.

Выказваючы задаваленьне тым, што меў магчымасьць пазнаць Беларусь і Менск, прафэсар Антаневіч падкрэсьліў, што выдатнай заслугай Беларускай Акадэміі Навук зьяўляецца ўключэньне ў свае навуковыя дасьледваньні таксама капітоўных археолёгічных дасьледваньняў. У іншых галінах,— гаворыць праф. Антаневіч, — не змогу ацаніць становішча і ўздым дасьледваньня і вопыту, якія выконвае ў некалькіх лябораторыях БАН і якія я меў магчымасьць бачыць. Мяркуючы-ж па пакаёвых і даволі значных дыфэрэнцыяваных выданьнях БАН, можна пераканацца, што ў апошнія гады навуковая дзейнасьць гэтай важнай установы дайшла да значнага напружаньня.

На апошняе пытаньне, як праф. Антаневіч уяўляе зьбліжэньне навукі БССР і Польшчы, — адказаў:

— У інтарэсах абедзьвюх краін трэба імкнуцца да цеснай супольнай навуковай работы паміж абедзьвюма краінамі, якія на суседніх тэрыторыях маюць амаль аднолькавыя зьявішчы для апрацоўкі і вырашэньня. Тут не хапае толькі абмену выданьняў, якія трэба лепш арганізаваць і пашырыць. Неабходным зьяўляецца разам з тым непасрэдны абмен навуковых мысьляй і меркаваньняў. Я быў бы вельмі шчасьлівы, калі-б мой даклад, які я прачытаў па запрашэньні Беларускай Акадэміі Навук у Менску, быў пачаткам нашых пастаянных узаемных навуковых адносін.

У заключэньне гутаркі праф. Антаневіч выказваў за гасьцінасьць і палягчэньне яму навуковай работы ў Менску.

(БЕЛТА).

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Чырв. Зорка Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30. Каса ад 1 г. дня. Гукавы гаваршчы фільм СПРАВЫ І ЛЮДЗІ.

Інтэрнацыянал. БЕЛЫ АРОЛ. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ Кіно-хроніка Саюзкіно

Пралетары. ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ Мядзьвежая даліна. Дзённыя дзіцячыя сеансы. Мастацкі фільм ЦАЦКІ

«СПАРТАК» Пач.: 7, 8-10, 9-20, 10-40. Каса — з 3 г. Выдатны фільм ПРАСТЫТУТКА. Драма ў 7 частках.

Інстытут Ахоны Мацярынства і Дзяцінства НКАЗ Бел. АРГАНІЗУЕ 6-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ па падрыхтоўцы спэцыяльнікаў ахоны мацярынства і дзяцінства. На курсы прымаюцца асобы ад 18—35 год., якія маюць адукацыю ня менш 4 груп.

Пры падачы заяў неабходна прадставіць дакументы аб сан. становішчы, адукацыі, мэтрычную выпіс, характарыстыку грамадзкіх арганізацый і даведку з месца працы.

Стыпендыяй забясьпечваюцца да 40 руб. Інтэрнат не прадастаўляецца.

Прыём заяў праводзіцца ў інстытуце ахоны мацярынства і дзяцінства (Савецкая, 16).

Заявы прымаюцца да 10 лістапада. Пачатак заняткаў 15 лістапада.

Выдавецтву „Зьвязда“ патрэбна пішучая МАШЫНКА. З прапановамі зварачацца ў кантору выдавецтва „Зьвязда“ Савецкая, 63, 2-гі паверх.

МЯНЯЮ ў Віцебску кватэру ў цэнтры гораду, 3 пакоі і кухня з выгодамі на кватэру ў Менску. Зварачацца: Віцебск, Хайкін завул. № 9-9, або Менск, Камуністычны Ін-т журналістыкі, да т. Шіка.

Пры рамонтнай канторы Гаржылсаюзу па Інтэрнацыянальнай вул. № 3 АДКРЫТ МАГАЗЫН ШЫРСНАЖЫВУ. БУДМАТАР'ЯЛАЎ. Матар'ял адпускаецца ЖАКТ'ам, а таксама найшчыкам жактаў па адносінах праўленьня жактаў. Кантора.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ БУДАЎНІЧЫ ІНСТЫТУТ АПАВЯШЧАЕ студэнтаў, прынятых на дзённыя аддзяленьні Ін-ту па асеньнім НАБОРЫ 1932 году, што яны павінны зьявіцца на заняткі 31 кастрычніка г. г. у 9 гадзін раніцы.

Студэнты з іншых гарадоў, павінны мець пры сабе пасьцельныя прылады, бо апошніх у інстытуце няма.

Студэнты, што прыбываюць абавязаны зарэгістраваць у канцылярыі інстытуту: г. Менск, пр. Універсытэцкай і Чырвонаармейскай вуліц, дом № 42-8.

Дырэкцыя інстытуту.

СЭКТАР КАДРАЎ ОСУ (б. ОРУ) АРГАНІЗУЕ 2½ месячн. КУРСЫ па падрыхтоўцы статыстыкаў для сыстэмы БЕЛСАДГАРОДНІНЫ.

Стыпендыя ад 50 да 100 руб. у месяц і кватэрных 25 руб. Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.

Пасьля сканчэньня курсаў абавязаны працаваць 2 гады ў сыстэме Белсадгароднины на рабоце.

Заявы в дакументамі: аб сан. становішчы, аб адукацыі (ня ніжэй 5-ці груп), аб узросьце паціраваць у канцылярыю ОСУ (г. Менск, Камуністычная № 16 „УНХУ“, 2-гі паверх, пакой 11) да 6 лістапада г. г.

Дзяржаўны вучоны савет і цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў БССР склікаюць на 31 кастрычніка НАРАДЫ ПА ПЫТАНЬНІ аб мэтадах выкладаньня па наступных дысцыплінах

а) Па матэматыцы—адказны т. Согаловіч.
б) Па біялёгіі „ т. Гроссе.
в) Па фізыцы „ т. Усьпенскі.
г) Па хіміі „ т. Гінзьбарґ.
д) Па сац. гістарычн. „ т. Мотэлін.
е) Па мэдыцыны „ т. Чэрвякоў.
ж) Па літарат.-лінгв. „ т. Пётухэвіч.
з) Па педалёгіі-педаг. „ т. Пенкевіч.

Усе наряды адбудуцца ў прыродазнаўчым корпусе (Універсытэцкі гарадок).

На нарады павінны зьявіцца ўсе выкладчыкі ВНУ паказаных дысцыплін г. Менску, а таксама представіцелі Гомелю, Горан, Магілеву і Віцебску.

Нарады адкрываюцца роўна ў 10 гадзін раніцы агульным уводным пасяджэньнем у 301 аўдыторыі прыродазнаўчага корпусу.

Яўка без спэцыяльных.

СТАРШЫНЯ ДВС ВАЛЬФСОН.
СТАРШЫНЯ ЦБ СНП БССР РЫЎЛІН.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА Дзяржаўнага Вучонага Савету Наркамасьветы БССР.

Дзяржаўны Вучоны Савет прапануе дырэктарам усіх вышэйшых навучальных устаноў і навукова-дасьледчых устаноў БССР прадставіць сьпісы асоб, якія заняли ў гэтых установах пасады прафэсароў, вучоных спэцыялістаў, дацэнтаў і старшых навуковых супрацоўнікаў, пачынаючы з 1-га ліпеня 1930 г.

У сьпісах павінны быць паказаны: фамілія і імя прапаўніка; займаемая пасада. Кім і калі прызначан. Кім і калі зацьверджан у гэтай пасадзе. Пералік навуковых прац.

Сьпісы павінны быць накіраваны да 5-га лістапада г. г. у 2-х экз. па адрасе: Менск, пляц Волі, НКА, Кваліфікацыйная камісія ДВС.

Нам. Наркома Асьветы БССР старшыня Дзяржаўнага Вучонага Савету Вальфсон.

Вучоны сакратар ДВС Чмялёўскі.

Расьпінскі натарыяльны тэхнікум буйнай гарэтай жывёлы абвешчае дадатковы НАБОР студэнтаў на 1-шы курс з адукацыяй ня ніжэй 7-годкі. Паступаючыя трымаюць іспыты, згодна пастановы ЦВК СССР. Усе прынятыя ў тэхнікум забясьпечваюцца інтэрнатам, а стыпэндыяй, згодна пасьпяховасьці, ад 45 руб. да 90 руб. Дакументы падаваць да 1 лістапада.

Заняткі з 10 лістапада.

Адрас: м-ка Расна, Мсьціслаўскага раёну, Вэтэхнікуму.

Дырэктар Ігнаценка.

29-X—32 г. у 7 гадз. вечара, у памяшканьні Менгарсавету (малая зала) адбудзецца ЗЬЛЁТ ДЭПУТАТАЎ І СЭКЦЫЯНЭРАЎ ГАРСАВЕТУ. Яўка абавязкова. Менгарсавет.

ПРЫЕМ на 3-хгадовае аддз. ВНСГШ (б. КІМВУЗ) СПЫНЕН. Аб правілах прыёму на 2-х гадовае аддз. будзе паведамлена асобна. Ректар ВНСГШ.

Менск, друкарня «Зьвязды» Галоўлітбел 337.